№ 3 (65)/2008

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК – ВАРШАВА, лістапад-сьнежань 2008 г.



(Фота з Сеціва)

*„Крыжовы шлях -2008.” Шэсьце ў Курапаты на Дзяды.*

## СЬВЕТЛАЯ, ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ ХАЙ СТАНЕ НАШЫМ СЬЦЯГАМ!

Споўнілася 20 гадоў Народнаму Фронту – арганізацыі, дакладней, руху, якія адчыніў новую старонку ў гісторыі Беларусі. Самае галоўнае: была дасягнута рэальная незалежнасьць Беларусі, закладзены структурныя і праўныя асновы незалежнай беларускай дзяржавы, падрыхтаваны палітычны і ідэалягічны крах каляніяльнай камуністычнай сістэмы і сьветапогляду. Была адчыненая магчымасьць (да 1994 г.) культурна-нацыянальнага адраджэньня і развіцьця Беларускага народа.

Межавыя слупы дзейнасьці Фронту – гэта **1988** (адкрыцьцё Курапатаў і стварэньне БНФ), **1989** (праўда пра Чарнобыль; Устаноўчы зьезд), **1990** (выбары ў Вярхоўны Савет і стварэньне дэпутацкай Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня; распрацоўка і прыняцьце Дэклярацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі; канцэпцыя Балта-Чарнаморскай Садружнасьці), **1991** (здабыцьцё незалежнасьці; прыняцьце дзяржаўных сымвалаў Рэспублікі Беларусь – *Бел-Чырвона-Белага Сьцяга і гэрбу Пагоня*), **1992** (параза, антызаконная забарона рэфэрэндуму аб выбарах і перамене ўлады), **1993** (пастаноўка пытаньня, прапаганда і змаганьне за адстаўку Урада Кебіча), **1994** (вылучэньне на прэзыдэнцкіх выбарах нацыянальнага кандыдата ад БНФ з дэталёвай праграмай дзяржаўнага і эканамічнага будаўніцтва вольнай, дэмакратычнай Беларусі), **1995** (вайсковы напад на дэпутатаў Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце і зьбіцьцё галадуючых дэпутатаў; пачатак дыктатуры), **1996** (24 сакавіка – масавы мітынг у Менску супраць саюзнай дамовы з Расеяй – магутны ўдар па дыктатуры, які меў міжнародныя вынікі; эміграцыя і дзейнасьць лідэраў БНФ за мяжой, якая прымусіла Захад прызнаць наяўнасьць дыктатуры ў Беларусі і зьмяніць сваё стаўленьне да афіцыйнага Менску), **1997** (вылучэньне і прыняцьце ідэі Вызвольнага руху), **1999** (раскол Народнага Фронту на дзьве арганізацыі).

Мінула 9 гадоў пасьля расколу. Час не малы. Мы добра памятаем, як было, якія былі заявы, лямaнты, пляны, хто што рабіў і чаму. Пара падвесьці вынікі і назваць „героў”, якія менавалі сябе „маладымі прагматыкамі”, „новай хваляй” у БНФ.

Ініцыятарамі „новай хвалі” „маладых прагматыкаў” былі Ю. Хадыка, А. Бяляцкі, В. Вячорка і В. Івашкевіч. Зьмест „хвалі” заключаўся ў „абнаўленьні” Фронта, пераўтварэньні яго ў шырокі дэмакратычны рух, адкрыты для дэмакратыі і ініцыятывы яго ўдзельнікаў. Ідэалёгію „хвалі” ў голас ня вызначылі, але было заяўлена і надрукавана Ю. Хадыкам, што Беларуская Нацыянальная ідэя сябе вычарпала і што добра было б аб’яднаць БНФ з прамаскоўскай АГП (Лябедзькі). Дакладна гэта гучыць так: *„ Нацыянальна-вызвольная ідэя, якая была стрыжнем у дзейнасьці БНФ з канца 80-х гг., у значнай ступені вычарпала сябе”... Аптымальна было б не падзяліць Фронт, а аб’яднаць яго з Аб’яднанай грамадзянскай партыяй і іншымі партыямі гэтага накірунку.” (Ю.Хадыка. Бюлетэнь „ Избиратель”, №9, чэрвень, 1999 г.).* Сымптаматычна, што такое было напісана тады, калі „ініцыятары” рыхтавалі пераварот у БНФ. З гэтым усе прагматыкі моўчкі і пагадзіліся. Шараговым фронтаўцам прапаноўвалі „сучасны ўзровень” дачыненьняў у палітыцы, выхад на новыя далягляды, на цеснае супрацоўніцтва з эўрапейскай дэмакратыяй, на міжнародную салідарнасьць у барацьбе з дыктатурай, на „эўрапейскі стандарт” у палітыцы”. Адпаведна „эўрапейскі стандарт” (калі яго прыняць) мусіў бы ў корані эўрапеізаваць жыцьцё і змаганьне змагароў Фронта. Фронтаўцам абяцалі офісы і кампутары, друкаркі і тэлефоны, усю так неабходную для такой новай „палітыкі” апгтэхніку, канфэрэнцыі за мяжой, трыбуны, тэлеэфір і т.п. Шмат каму гэта, відаць, спадабалася, напоўніла сэрца радасным трымценьнем сапраўднай (як яны, відаць, думалі ) барацьбы. „Пазьняк не дасьць зарабляць „бабкі”, – сказаў крылатую фразу адзін змагар (якога потым нават самы прагматыкі літаральна вынесуць з свайго асяроддзя за няўемны імпэт).

З боку так званай „Эўропы” „салідарнасьць” насіла таксама чыста прагматычны характар. Ім сказалі (канкрэтна А. Бяляцкаму): калі пасьля зьезду кіраваць Фронтам застанецца Пазьняк, ніякіх інвэстыцыяў вы не атрымаеце.

А гэта сур’ёзна. Лявона Баршчэўскага, які ніяк ня мог вызначыцца з „новай хваляй”, нарэшце, дадушылі, і ён (папярэдне пажаліўшыся на мяккасьць свайго характару і ўзяўшы на сябе віну за непарадак у Фронце) прафэсійна правёў зьезд у інтарэсах прагматыкаў – заблытаў некарысны для „рэвалюцыянераў” вынік галасаваньня і падвесіў пытаньне, не давёўшы зьезд да заканчэньня.

Наступным заканчэньнем гэтага зьезду (які сабраўся праз два месяцы) стаўся раскол. Прагматыкі па закліку Ю. Хадыкі пакінулі залю і вечарам правялі асобны зьезд. Пасьля гэтага Л. Баршчэўскі адышоў ад палітыкі і ад кіраўніцтва, а прагматыкі засталіся са сваёй рэштай, ілюзіямі і спадзяваньнямі.

І я, і мае сябры-фронтаўцы, што прайшлі праз парляманцкую барацьбу, ня раз пісалі і казалі „прагматыкам” спыніцца, ня блытаць палітыку з бізнэсам, не спакушацца на чужыя грошы, бо за чужымі грашыма ідуць чужыя інтарэсы і маральнае разбурэньне ўдзельнікаў руху. Казалі пра моц ідэёвасьці і салідарнасьці, пра абавязковае набыцьцё павагі ў людзей (як было ў пачатку), папярэджвалі пра фальшывасьць шляху, які прывядзе да ганьбы і здрады.

Але ўсе нашыя словы прапалі марна, бо тут адбыўся ня столькі палітычны, колькі маральны выбар. Бальшыня прагматыкаў добра ўсьведамляла, што рабіла і на што пагаджалася.

***Прагматызм у палітыцы ёсьць адмоўная характарыстыка і адмоўная зьява. Гэтым ніхто ня хваліцца, бо прагматыка прыводзіць да бяспрынцыпнасьці і карупцыі, да гніеньня сістэмы.*** У Беларусі, аднак, знайшлі людзей, якія думалі зрабіць з прагматызму правілы паводзінаў у апазыцыйным змаганьні. Але гэта немагчыма, бо апазыцыя да палітычнага рэжыму ня ёсьць прагматычным дзеяньнем. Калі ў апазыцыі пачынаюць гаварыць пра прагматыку – гэта значыць, што мосьціцца шлях да калябаранцтва, шкурніцтва, двайнога стандарту, да шуканьня выгады ад апазыцыйнай справы. (Пра прагматызм гавораць ва ўладзе.) Аднак для прагматыкаў гэта ўсё тэорыя, якая ня мае значэньня для людзей, калі яна пярэчыць іхным жаданьням.

Ну і дзе цяпер „новая хваля”? Якія посьпехі прагматычнай палітыкі? Ніякія. Якія дасягненьні? Ніякіх. Затое пройдзены ўвесь шлях дэградацыі і маразму, пра якія мы, адраджэнцы, казалі ім у 1999-м.

Самае неверагоднае, што адбылося з прагматыкамі БНФ, – гэта супрацоўніцтва з камуністамі, са старой капээсэсаўскай намэнклятурай тыпу члена бюро ЦК КПБ, нашага злоснага і праваленага тады фронтаўскага суперніка на выбарах 1990 года – Уладзімера Ганчарыка. Яны агітавалі за яго на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. Цяпер дакладна вядома: так патрабавалі ад іх заходнія спонсары, і прагматыкі прагматычна пайшлі за камуністам, за нашым ворагам і апанэнтам. У 1991-м такое не магло б прысьніцца і ў страшным сьне. Потым яны падтрымлівалі капээсэсьнікаў М. Марыніча, С. Калякіна, А. Мілінкевіча, А. Казуліна і ўсю антыфронтаўскую камарыльлю, аб’ядналіся зь імі ў адну палітычную групу. Ізноў жа, аб’ядналіся таму, што таго аб’яднаньня патрабавалі заходнія спонсары і абяцалі рэсурсы. Гэта ўжо нават не палітыка, а фірма, „гээмбэха” – таварыства з абмежаванай адказнасьцю, якое жыве з інвэстыцыяў. На чалавечай мове гэта называецца здрада, нізкая і нікчэмная, адыход ад ідэалаў беларускага змаганьня, поўнае выпадзеньне зь беларускай нацыянальнай палітыкі, пераход у глыбокі маргіналізм (якой зьяўляецца так званая „вікаўская апазыцыя”) у поўную палітычную беспэрспэктыўнасьць. Існаваньне гэтай фірмы пад назвай „дэмакратычная апазыцыя”, куды ўвайшлі прагматыкі з БНФ, абумоўлена існаваньнем рэжыму Лукашэнкі. Найбольш цынічныя зь іх кажуць у голас, што Лукашэнка, фактычна, дае ім „працу”, магчымасьць існаваць, „зарабляць бабкі”.

Рэальнасьць паказала, што прагматычная стратэгія і тактыка ўсіх выбараў і рэфэрэндумаў, у якіх удзельнічала падстаўная „апазыцыя”, – усё гэта было фактычным спрыяньнем рэжыму. Асабліва ўразілі (выклікалі проста шок) палітычна амаральныя паводзіны гэтай „дэмапазыцыі” на выбарах і антызаконным рэфэрэндуме ў 2004 годзе пра трэці тэрмін Лукашэнкі.

Памятаеце іхны агітацыйны цынізм: „Ідзі і скажы сваё „НЕ” Лукашэнку!” Гэта казалі тады, калі катэгарычна нельга было ісьці галасаваць на антызаконны рэфэрэндум. Народ не павінен удзельнічаць у крымінальных дзеяньнях рэжыму і браць на сябе адказнасьць за злачынствы ўлады. Прагматыкі гэта ведалі, але агітавалі. Чаму?! Бо так хацелі заходнія спонсары, якія не разумеюць зьместу таго, што адбываецца ў Беларусі (і не імкнуцца зразумець), але маюць свае інтарэсы ў нашаў краіне, свой погляд на месца яе ў іхняй палітыцы. Гэтаму спрыялі і пэўныя, зьвязаныя з замежнымі спонсарамі, „сацыялягічна-назіральныя” структуры ў Беларусі, якія атрымлівалі заходнія гранты за „сацыялёгію” і „назіраньне”. І „прагматыкі” пайшлі казаць сваё „не”.

Супрацоўніцтва з капээсэсаўскай намэнклятурай і ворагамі Народнага Фронту ў Беларусі адносіцца да разраду злачынстваў у палітыцы. Сутнасьць асаблівай сытуацыі, якая склалася ў Беларусі і якой не было больш нідзе у СССР (нават на Ўкраіне), заключалася ў тым, што ***камуністычная кіроўная намэнклятура ў Беларусі была катэгарычна і арганічна антыбеларуская, антынацыянальная і антыэтнічная.*** Яна арыентавалася на Маскву, думала катэгорыямі СССР і па рэакцыйнасьці пераўзыходзіла расейскую. Як гэта ні парадаксальна, але ў 70-80-х гадах управу на антыбеларускі маразм гэтай намэнклятуры беларусы часам вымушаныя былі шукаць (і знаходзілі) у Маскве (яскравы прыклад – разбурэньне вуліцы Няміга ў Менску ў 60-70 гадах).

Акрамя двох-трох асобаў (далёка не на першых ролях) у беларускай намэнклятуры не было нацыянал-камуністаў. І паняцьця такога не існавала (і цяпер не існуе). Капээсэсаўская намэнклятура ў Беларусі была галоўным праціўнікам беларускага Адраджэньня, беларускага нацыянальнага руху і беларускай незалежнасьці. Гэта быў галоўны вораг Народнага Фронту, супраць якога змагаўся Народны Фронт за дэмакратыю і незалежнасьць Беларусі. Гэта была тая цёмная сіла, якую 24-25 жніўня 1991 года дэпутатам–фронтаўцам ўдалося аглушыць сваім напорам і вырваць незалежнасьць Бацькаўшчыны зь яе аслабленых лап.

А тым часам яшчэ 20-га жніўня, у пачатку путча, яны (напрыклад, дэпутат Міхаіл Жэбрак, першы сакратар Ваўкавыскага гаркаму КПБ-КПСС) у вочы казалі дэпутатам Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, што мы ўсе

будзем расстраляныя. І раптам праз тры дні такая перамена. Было ад чаго ім перапалохацца і разгубіцца. І вось тут спатрэбіўся наш кулак.

Пасьля 25 жніўня намэнклятура ўсімі сіламі супраціўлялася незалежнасьці Беларусі, сабатавала будаўніцтва інстытутаў незалежнай дзяржавы, сабатавала стварэньне незалежнага дзяржаўнага заканадаўства. Дэпутатам ад БНФ і ўсяму Фронту велізарнымі намаганьнямі прыходзілася ўсё выдзіраць для вольнай Беларусі з гэтага варожага балота капээсэсаўскай савецкай намэнклятуры, у якой была ўлада. Усё, што адваявана ў іх для Беларусі, было зроблена Фронтам: і гэрб *Пагоня*, і *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг,* і беларускае войска, і беларускае грамадзянства, і беларускія амбасады, і льготы чарнобыльцам, і аздараўленьне дзяцей, і беларускія грошы, і нэўтралітэт, і ваенная дактрына, і нават новая форма адзеньня беларускай міліцыі і войска, – усё праходзіла праз дэпутатаў БНФ у барацьбе і змаганьні за беларускую дзяржаву супраць савецкай намэнклятуры.

Незалежнасьць Беларусі не зрабіла намэнклятурных камуністаў дзяржаўнікамі. У 1992 годзе яны з новым імпэтам павярнулі ў Маскву і такімі прамаскоўскімі засталіся і цяпер, незалежна ад таго, ці яны служаць рэжыму, ці бавяцца ў апазыцыйныя фразы. Гэта відавочны факт, які ня трэба нават ілюстраваць. Паглядзіце толькі на гэтых Марынічаў, пачытайце мэмуары гэтых Кебічаў!

***Здрада прагматыкаў, супрацоўніцтва з камуністамі, з прамаскоўскай намэнклятурай – гэта для нас (тых, што змагаліся за незалежнасьць) ня проста здрада. Гэта нешта горшае – гэта як паклёп на ідэю, за якую пакаленьні беларусаў ішлі на сьмерць.***

Сёлетнія выбары ў „палату” і чарговы правальны спэктакль падстаўной „дэмапазыцыі” перапаўняе ўжо чашу цярпеньня. Дзякуй Богу, у агульным адбылося так, як хацелі мы, франтаўцы КХП-БНФ, а ня купленая публіка. Народ не пайшоў галасаваць. Мы ведалі настрой людзей, бо гадамі спрыялі яму. У другой палове верасьня сытуацыя для рэжыму была крытычнай. Стала зразумела, што людзі галасаваць ня пойдуць, а рэжым тым часам ня даў ні найменшых шансаў для падстаўной апазыцыі, якая ў яго „палаце” яму непатрэбная (іхняя функцыя заганяльшчыкаў, а не „парле-трыбюн”). Тым часам мэдыйная і палітычная ўвага сфакусавалася на гэтай сытуацыі. Самы час быў за 3-4 дні да галасаваньня зьняць сваіх кандыдатаў у знак пратэсту і заклікаць да байкоту галасаваньня. Гарантаваны посьпех (людзі ж усяроўна ня йшлі галасаваць). Усе тое бачылі і разумелі. Дэмарш стаў бы моцным ударам па рэжыму. Ён здрыгануўся б. Пасьля гэтага ягоная заява пра 75 адсоткаў прагаласаваных сталася б яму, як цьвік у труну. Тут трэба было рашаць хутка, мабільна, узгоднена і адразу. Адчынілася слабое месца, рэжым падставіўся.

І што зрабілі гэтыя палітычныя марыянеткі? Нічога. Пайшлі „выбірацца”. Тут ужо размова не пра бяздарнасьць. Гэта паталёгія палітычнай нікчэмнасьці. Галоўнае для іх – выканаць заказ спонсара. А спонсар (у сваіх інтарэсах) узяў і павярнуўся тварам да Лукашэнкі. „Нас кінулі!” – плаксьліва заламантавалі прагматыкі. Нейкі фарс з удзелам шыльдбюргераў.

Гэтай квазі-апазыцыі сапраўды пара зьнікнуць (трымаецца толькі на спонсарах). Яна ўжо цалкам зганьбілася перад людзьмі, вычарпала свае маргінальныя, падстаўныя магчымасьці і, аказваецца, не задавальняе ўжо і рэжым. Такі бясслаўны канец гэтай бясслаўнай прагматычнай і разбуральнай ерасі.

* * *

Але вернемся яшчэ на дзевяць гадоў у тыл. Глянем больш дэталёва. Раскол рыхтавалі людзі, якія не былі ў парляманце, ня мелі парляманцкага вопыту, не ўваходзілі ў дэпутацкую Апазыцыю БНФ. Адзіны дэпутат, які меў дачыненьне да расколу, – гэта Лявон Баршчэўскі. Гісторыя даволі сумная. Апынуўшыся за мяжой, я рэкамендаваў Л. Баршчэўскага на выконваючага абавязкі Старшыні Беларускага Народнага Фронта на Беларусі. (Баршчэўскі вельмі добра засьведчыў сябе ў Вярхоўным Савеце.) Неўзабаве (асабліва пасьля ўзмацненьня рэжымнай рэакцыі) Л. Баршчэўскі адчуў на сабе ціск групы расколу і патрапіў нібы паміж двух агнёў: паміж групай і Фронтам. Дзеяньні яго робяцца што раз больш непасьлядоўнымі і супярэчлівымі. На V зьездзе Фронта, аднак (1997 г.), група расколу правалілася цалкам (Ю. Хадыка пасьля свайго выступу ледзь прайшоў у Сойм з перавагай у адзін голас).

У 1999-м, пасьля тактычнай і фінансавай „прапрацоўкі” Ганса Віка і правалу афёры В. Ганчара з так званымі „альтэрнатыўнымі” выбарамі прэзыдэнта, сытуацыя зьмянілася да горшага. Маскоўска-ганчараўская авантура (у якой Ганчар быў проста шулерскім выканаўцам) разбэсьціла многіх людзей грашыма. Паспытаўшы лёгкіх даляраў, некаторыя адчулі млоснае кружэньне галавы. Пачаліся адкрытыя атакі, у якіх павялічылася колькасьць прыхільнікаў прыемнай (як ім, відаць, здавалася) прагматычнай палітыкі (і, вядома ж, „абнаўленьня” Фронту). У гэтай сытуацыі, пакідаўшыся ў розныя бакі, Л. Баршчэўскі здаўся і стаў на бок прагматыкаў.

Гэты крок быў вельмі адмоўна ўспрыняты ў Фронце. Бо Л. Баршчэўскі, у адрозьненьне ад прагматыкаў-раскольнікаў, меў прафэсійны палітычны вопыт працы ў парляманце і здольнасьць сістэмнага палітычнага думаньня, разумеў сэнс нацыянальнай палітыкі. Непраяўленьне волі сыграла тут дрэнную ролю. Была зроблена відавочная (прытым непапраўная) стратэгічная хіба. Усе мае спробы, прапановы і варыянты захаваньня адзінага Фронту (нават як кааліцыі франтаўскіх партыяў) былі марнымі. Воля замежнага спонсара для прагматыкаў аказалася непахісным аргумантам у выбары паводзінаў.

У чэрвені 2006 года я паспрабаваў сабраць у Вільні на нараду дэпутатаў Апазыцыі БНФ Вярхоўнага Савета 12-га скліканьня. Пагадзіліся ўсе, але змагла прыехаць толькі палова. На той нарадзе, у працэсе абмену думак і размоваў, у мяне склалася ўражаньне, што ў глыбіні душы Л. Баршчэўскі зразумеў неабдуманасьць сваіх паводзінаў у 1999 годзе (хоць пра раскол БНФ мы прынцыпова не гаварылі). Тым больш, што вынікі „прагматычнага” развалу і тупіка былі відавочныя.

Да цяперашняга часу ў атмасфэры „новай хвалі” вырасла за дзевяць гадоў на прагматычных прынцыпах (і закасьнела) цэлае пакаленьне новых прагматыкаў, якія ўжо нічога, акрамя грантавага апазыцыйнага маразму, ня бачылі і лічылі яго нормай адносінаў.

Канфлікт паміж старымі і новымі („прагмацейшымі”) прагматыкамі заканамерна зьявіўся і заканамерна ўзьнік па той жа схеме, што і ў 90-х, з той хіба розьніцай, што выглядаў нікчэмным фарсам. І тут, ратуючы старых ініцыятараў, у кіраўніцтва прагматычнай Партыі БНФ зноў вяртаецца Л. Баршчэўскі.

Можна зразумець станоўчыя матывы гэтага зруху (магчыма, нават, імкненьне апраўдацца за абвал 1999-га, паправіць становішча). Але, як казалі старажытныя грэкі, „за што боролись, на то и напоролись”. Ні выправіць прагматычны выбар 1999 года, ні сьцвердзіць яго жыцьцяздольнасьць ужо ня ўдасца. Прынамсі тым, хто гэта рабіў. Марныя спадзяваньні.

Адзіны рух Народнага Фронту ўжо даўно не адзіны, ён расколаты, пазыцыі яго разышліся ў розныя бакі. Прагматызм часткі былога БНФ і ўся вульгарная канцэпцыя паразітаваньня на чужых рэсурсах і чужых інтарэсах, непераборлівасць у саюзах і аб’яднаньнях, ператварэньне на гэтай аснове ў «шырокі дэмакратычны рух» – усё гэта абанкруцілася. Прагматызм павінен быць адкінуты з дарогі нацыянальнага змаганьня.

* * *

Стратэгічная палітыка дасягненьня незалежнасьці і будаўніцтва незалежнай беларускай дзяржавы зыходзіла, найперш, з франтаўскага авангарду – дэпутацкай Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце.

У 1990 годзе ў Вярхоўны Савет прайшлі старшыня БНФ З. Пазьняк, сябры Сойму БНФ А. Трусаў, С. Антончык, П. Садоўскі і некалькі вядомых франтаўцаў: В. Голубеў, І. Гермянчук, Ю. Беленькі, С. Навумчык, Л. Баршчэўскі. Былі таксама шараговыя сябры Фронту, якія на той час яшчэ шырока не засьведчылі сябе ў палітыцы. Але жорсткая школа парляманту і новага ўзроўню палітычнае барацьбы хутка зрабіла сваю справу. Праз кароткі час у Вярхоўным Савеце сфармавалася палітычная эліта Фронту. Кожны сябра дэпутацкай Апазыцыі БНФ зрабіў вялікі крок наперад у сваім палітычным разьвіцьці. Рэчаіснасьць вучыла нас, а мы вучыліся адзін у аднаго дружна, сьмела ісьці да адзінае мэты. Ужо ў Вярхоўным Савеце да Апазыцыі БНФ

далучыліся некаторыя незалежныя дэпутаты, імёны якіх неўзабаве сталі вядомымі на ўсю Беларусь: гэта палкоўнік міліцыі Ігар Пырх, лагойскі лекар Аляксандар Шут, Галіна Сямдзянава, Аляксандар Сасноў і іншыя.

Узьнікненьне палітычнай перадавіцы Фронту і хуткае дасягненьне галоўнай мэты – незалежнасьці Беларусі – станоўча паўплывала на рост папулярнасьці і на магчымасьці Народнага Фронту. Гэта разумелі ў Фронце ўсе. Праўда некаторых (напрыклад, майго намесьніка Ю. Хадыку) яно тады неяк дзіўна бянтэжыла, выклікала нават невытлумачальныя пасажы, прычыну якіх я схільны быў бачыць толькі ў эгацэнтрызме асобы, калі б не адна акалічнасьць, якая цалкам стала відочнай і зразумелай пазьней. Падважвалася неабходнасьць палітычнай дамінацыі Фронту (і гэта тады, калі яна была) як нацыянальна-адраджэнскай і вызвольнай сілы. Пастаянна ўзьнікалі прапановы ўпіхнуць Фронт у стандартную пастку, расстаўленую агентурай – гэта значыць аб’яднацца з „малымі партыямі” і ператварыцца ў так званы „агульнадэмакратычны рух”.

І другое, што найбольш ваявілася потым, пасьля расколу, – гэта фактычная падтрымка камуна-гэбоўскай канцэпцыі „скрыўленага вобразу”, распрацаванай і выпрабаванай у прапагандзе супраць мяне яшчэ за часы КПСС. Вынікі „прапаганды” зьявіліся. Для 15-20 адсоткаў беларусаў (як паказвае, праўда, тэндэнцыйная „сацыялогія”) маё аблічча скрывілі так, што распазнаньню не падлягае.

Пасьля майго ад’езду зь Беларусі аналягічнай справай (як ня дзіўна) заняўся Ю. Хадыка, абзываючы мяне то „манахам аскетам”, то „нарцысам”, то фанатыкам. Дарэчы, ніхто з фронтаўцаў „прагматычнай хвалі” (апрача Хадыкі) не ахайвае майго імя (лічаць за лепшае проста замаўчаць).

У цэлым, ніхто ў Фронце (ізноў жа, акрамя Хадыкі) не выступаў і супраць канцэпцыі Вызвольнага Руху.

Абвяшчэньне Фронтам Вызвольнага руху ў 1997 г. (V-ы Зьезд) абазначала ідэю аб’яднаньня беларускіх сілаў і стварэньне нацыянальнай адраджэнцкай альтэрнатывы прамаскоўскаму рэжыму. Гэта была альтэрнатыва сфармаваная па сутнаснай прыродзе палітычнага канфлікту, які існуе ў Беларусі. Яна стваралася пад сьцягам нацыянальна-дэмакратычных ідэй, замацоўвала дамінацыю Нацыянальнай ідэі і вядучую ролю Народнага Фронту.

Канфлікт паміж рэжымам і грамадзтвам мае ў Беларусі нацыянальны характар. Гэта антыбеларускі рэжым, і таму ён ня можа быць дэмакратычным.

Гэтак жа, як каляніяльная імпэрыя ня можа быць дэмакратычнай (бо, каб існаваць, яна вымушана душыць іншыя народы і свабоду), гэтак ня можа быць дэмакратычным рэжым антынацыянальны.

***Альтэрнатыва антынацыянальнаму рэжыму мусіць быць толькі нацыянальная***. Усё астатняе – маргіналізм. Усялякае іншае змаганьне ня будзе мець пэрспэктывы, апынецца ў тупіку.

Ні адна імпэрыя, і ў XIX, і ў XX стагоддзях, не развалілася ад udaраў дэмакратыі і ад дэмакратычных ідэй, а толькі ад нацыянальна-вызвольных рухаў. Савецкі Саюз даканала не перабудова, а народныя франты, якія былі нацыянальна-вызвольнымі рухамі. ***Нацыяналізм – сьмерць усялякай каляніяльнай імпэрыі. Нацыянальная альтэрнатыва – адэкватная зброя супраць антынацыянальнага рэжыму.***

Вось у чым была сутнасьць абвяшчэньня Вызвольнага руху. Натуральна, гэта занепакоіла Маскву і яе палітычных хаўрусьнікаў на Захадзе (яны ведалі і пра БЧС, і пра магчымасьці Беларусі пад кіраўніцтвам БНФ). У Менск прысылаюць Ганса Віка, абяцаюць сродкі, офісы і даляры і пачынаюць ствараць агульнадэмакратычную апазыцыю ў Беларусі ды развальваць БНФ.

Астатняе вядома: гэта „шырокая дэмакратычная апазыцыя” (з камуністамі ў кучы), вынішчэньне ўсяго беларускага (пры поўнай маўклівасьці Захаду) і дзевяць гадоў шырокага „апазыцыйнага” маразму.

Цяпер, седзячы на руінах прагматычнай сьвісьцёлкі, многія з прагматыкаў убачылі рэальнасьць і пачуваюцца ніякавата. Але толькі ня Ю. Хадыка. Рэальнасьць краху прагматычных надзей і маргінальнага тупіка яго не бянтэжыць. Ён і цяпер паўтарае сваё „стрыжана”. „А я і тады, і зараз лічу гэтую ідэю памылковай”, – піша ён пра Вызвольны рух. *(Народная Воля, 2008, 6 лістапада.)*

Сумняваюся, што аўтар тут не ўсьведамляў, што пісаў, але тым ня менш ён бярэцца пісаць і пра такія рэчы, пра якія мае зусім цьмянае ўяўленьне. Ю. Хадыка ня быў дэпутатам і ня ведаў, (ды-й не разумеў) шмат чаго, што адбывалася ў Вярхоўным Савеце. Аднойчы, у 1992 г., ён стаў сьведкам эмацыйнай рэакцыі фронтаўскіх дэпутатаў на антызаконнае рашэньне камуністычнага Вярхоўнага Савета аб забароне правядзеньня рэфэрэндума пра новыя выбары. Апазыцыя БНФ тады перажыла моцны і несправядлівы ўдар. Некаторыя гатовыя былі ў роспачы пакласьці дэпутацкія мандаты. Аднак мінуў першы шок, і дэпутаты пагадзіліся і зразумелі, што трэба працягваць барацьбу, карыстаючыся з істотных магчымасьцяў Вярхоўнага Савета. Выхад з парляманту на хвалі эмацыйнай рэакцыі (гэтага камуністы толькі і чакалі) абазначаў бы ў тых умовах поўны крах і ўлюлюканьне ўсьлед (не кажу ўжо пра тэлебачаньне і друк, якія мы не кантралявалі). Рэакцыя грамадзтва на забарону рэфэрэндума была пасіўная. Выхад фронтаўцаў у тых абставінах зь Вярхоўнага Савета імгненна прысьпешыў бы прамаскоўскую дыктатуру разам з ўвядзеньнем расейскага рубля (усе гэтыя працэсы ў кебічаўскім рэжыме стаялі на парадку дня). Кебіч ня меў крамлёўскіх амбіцыяў, і „інтэграцыя” разьвівалася б зусім па іншым сцэнары. Мы страцілі б незалежнасьць (і Лукашэнка не спатрэбіўся б).

Ю. Хадыка зноў паўтарае: „памылка”, „памылка”. Маўляў, трэба было кідаць Вярхоўны Савет. І так бясконца. (Яшчэ й піша пра гэта з важным выглядам.) *(Народная Воля, 2008, 6 лістапада.)*

Памятаю пасьля абраньня Лукашэнкі на прэзыдэнта Беларусі летам 1994 г. на паседжаньні Сойму спадар Хадыка ўвогуле „паверг” шмат каго ў глыбокі шок, прапанаваўшы, каб Фронт стаў супрацоўнічаць з Лукашэнкам і дапамагаць яму правільна выбіраць дзяржаўную палітыку. Я спыніў тады ўсялякае абмеркаваньне гэтай прапановы, сказаўшы, што ўсё стане відаць праз 100 прэзыдэнцкіх дзён. Тады будзе і рашэньне.

Пастаяннае імкненьне да калябаранцтва не вынікае, аднак, толькі з асабовасьці. Па сутнасьці (асабліва пасьля расколу Фронта), спадар Хадыка зрабіўся рэтрансьлятарам (гучнамоўцам) усёй гэтай брусэльска-маскоўскай небеларускай „апазыцыйнай” лухты, езьдзіў разам з прамаскоўскай публікай у Маскву, у СВОП, „Прэзыдэнт-гатэль”, слухаў там нямцовых, хакамадаў і ўсю гэтую варожую Беларусі падстаўную маскоўскую квазідэмакратыю, якой цяпер (15-га лістапада) Лубянка дала ў Маскве адмашку – самараспусьціцца і пад назвай „Правое дело” працаваць пад кіраўніцтвам Крамля, што гэтыя расейскія „дэмакраты” дружненька і зрабілі. (І каго тут яшчэ нашы схаласты хацелі заблытаць? Што яны там яшчэ пішуць?)

* * *

Які ж цяпер наш беларускі адраджэнцкі стан? Ёсьць дзьве істотныя рэальнасьці. Пасьля расколу Фронт аўтаматычна зьнізіў узровень і маштаб як аб’яднаўчы масавы нацыянальны рух. Тут чыстая тэхналёгія. Агульным і адзіным можа быць толькі цэлае (але ня часткі, якія разышліся). Патрэбныя ўмовы і час для крышталізацыі новай якасьці.

Са зьніжэньнем аб’яднаўчай магчымасьці фармальна змалела роля частак Фронту як палітычнай нацыянальнай альтэрнатывы рэжыму, ідэі якой жывуць у Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ.

Другая рэальнасьць у тым, што месца нацыянальнай альтэрнатывы рэжыму заняла маргінальная так званая „дэмакратычная апазыцыя”, створаная на падставе інтарэсаў Захаду і Масквы.

Маргінальная апазыцыя не пагрунтаваная на Нацыянальнай ідэі. Існаваньне яе ў якасьці палітычнай альтэрнатывы абазначае, што пры любых пераменах улады Беларусь будзе пазбаўленая нацыянальнай пэрспэктывы нармальнага народнага і культурнага разьвіцьця.

Цяперашняя маргінальная (ці падстаўная, як яе называюць) апазыцыя разам з камуністамі на чале, прамаскоўскімі агэпоўцамі, агентурай і прагматыкамі, у выпадку перайманьня ўлады (хоць у рэальнасьці гэта мала верагодна) магла б стаць ня менш небясьпечнай для незалежнай Беларусі, чым рэжым Лукашэнкі. Усьлед за гэтай публікай ідзе прадажнасьць, карупцыя, лібэралізм і распуста, слабая ўлада, расейская мова і пасаваньне перад Масквой, новы перадзел уласнасьці і новае расьцягваньне нацыянальнай маёмасьці.

Каб пазьбегнуць горшага, ***мы, беларусы, павінны адрадзіць наш Беларускі Народны Рух дзеля ліквідацыі прамаскоўскага рэжыму і адраджэньня Беларусі,*** дзеля ўсталяваньня добрага жыцьця для беларускага народа на сваёй зямлі і ў сваёй дзяржаве.

Людзі краіны з высокай цывілізацыйнай культурай у мінуласьці ня могуць жыць толькі фізічнымі інтарэсамі. Гэты стан уладнага цемрашальства, нізкасьці, хамства, зьдзеку і хлусьні ў стане спыніць і скончыць толькі салідарнасьць вышэйшых людзей. Памятаем, што рэжым прышоў да ўлады і трымаецца на цемры, расейскай саветчыне і КГБ. У гэтай сытуацыі ***беларускае культурна-нацыянальнае асьветніцтва ёсьць перадумова пасьпяховага змаганьня за свабоду, а нацыянальныя ідэалы – першасная зброя барацьбы.*** І ня трэба слухаць дэмагогіі пра „новую сучаснасьць”, глабалізацыю і т.п. Мы добра ведаем, што нацыянальная культура ў сучасным сьвеце ёсьць найвялікшы чыньнік суверэнітэту, а нацыянальная адукацыя і інтэлект – найважнейшы рэсурс і сродак вытворчасьці.

Тое нацыянальнае самавызначэньне, што засталося нясконачаным у сьведамасьці грамадзтва сто гадоў таму і потым зглумленым з-за неспрыяльных абставінаў, мусіць быць хутка пройдзена цяпер (нават ва ўмовах антынацыянальнай улады, як кансалідацыя супраць гэтай улады). ***Змагацца супраць антынацыянальнага рэжыму трэба на нацыянальнай аснове.*** Ніякая дэмакратыя немагчымая ў нацыянальна незавершаным грамадзтве – будуць адны лукашэнкі. Сьветлая, вольная Беларусь хай стане нашым сьцягам. Тут, праз Беларусь, праходзіць для нас галоўны мерыдыян нашага часу. І нават ня часу, а сэнсу. Сэнсу ўсяго беларускага існаваньня.

*Лістапад 2008 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*Надрукавана: („Беларус”, – 2009, № 552, студзень).*



(Фота Я. Шатохіна)

***Юбілейнае паседжаньне Сойму КХП – БНФ пасьвечанае 20-годдзю БНФ.***

# КАСТРЫЧНІЦКІ ЮБІЛЕЙНЫ ПАШЫРАНЫ СОЙМ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ „АДРАДЖЭНЬНЕ” І КАНСЭРВАТЫЎНА-ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ПАРТЫІ – БНФ

19 кастрычніка сёлета споўнілася 20 гадоў з дня стварэньня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”. Да гэтай юбілейнай даты быў адмыслова прымеркаваны ў Менску пашыраны Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Фронтаўцы сабраліся ва ўрачыстай абстаноўцы з кветкамі і ўзьнятым настроем На сьценах віселі плякаты і заклікі часоў гістарычнага, узнёслага змаганьня. Сойм заслухаў віншавальны выступ сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „20 гадоў Беларускаму Народнаму Фронту „Адраджэньне” (публікуецца). З дакладамі выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў старшыні на Беларусі Фронту і Партыі, сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі, і Валеры Буйвал, сакратар Управы Фронту і Партыі. Выступоўцы выказалі словы віншаваньня ў адрас усіх патрыётаў Беларусі, якія на працягу дваццаці гадоў змагаліся за волю і незалежнасьць Бацькаўшчыны ў шэрагах БНФ „Адраджэньне”, падтрымлівалі Фронт, ўздымалі над краінай нацыянальны Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.

Змагарнае дваццацігоддзе супала сёлета з адметнай падзеяй у жыцьці Беларусі. Шматгадовая праца патрыётаў-фронтаўцаў, якія тлумачылі людзям неабходнасьць адвярнуцца ад рэжыма і ягонай псэўдаапазыцыі, завяршылася на прыканцы верасьня паразай прамаскоўскага рэжыму і прамаскоўскай псэўдаапазыцыі на парляманцкіх выбарах. Народны байкот выбарчага фарсу – гэта перамога беларускага грамадзтва, якое не дало ўцягнуць сабе ў злачынныя дзеяньні рэжыму і яго памагатых. У выніку незаконна ўтвораны псэўдапарлямант дыктатуры зьяўляецца нелегітымным. Нелегітымнымі будуць таксама ўсе рашэньні, якія стане прымаць гэтая незаконная структура.

Стала вядома, што вынікі народнага байкоту напалохалі Маскву і мясцовы прамаскоўскі рэжым. Партнёры па зьнішчэньню Беларусі баяцца цяпер выносіць на рэфэрэндум пытаньне аб незаконнай „саюзнай дамове паміж РФ і РБ”. На рэфэрэндум такія пытаньні, аднак, увогуле не выносяцца, закон забараняе. Але мы іх ведаем – чхаць ім на закон. Тым часам, і яны ўжо ведаюць, што мільёны беларусаў больш ня пойдуць на антызаконнае галасаваньне. Таму змоўшчыкі спрабуюць легітымізаваць сваю „саюзную дзяржаву” спосабам кулуарнага галасаваньня ў расейскай Дзярждуме і нелегітымных „палатах” РБ. Неабходна мабілізаваць усё беларускае грамадзтва на супрацiў гэтай антыканстытуцыйнай змове, якая зьяўляецца шляхам расейскай акупацыі Беларусі.

Разбуральны буйнамаштабны эканамічна-фінансавы крызіс ахапіў Расею. Хворая, заснаваная на алігархічных капіталах і інтэнсіўнай эксплуатацыі прыродных рэсурсаў эканоміка Расеі нясе буйныя страты. Сьвет можа стаць сьведкам пачатку чарговага этапу развала расейскай імпэрыі. Штучная, злачынная арыентацыя беларускай эканомікі на Расею пагражае грунтоўным крызісам і нашай краіне. У выніку крызісу ў Расеі і ўцёкаў капіталаў за мяжу рэзка спыняецца будаўнічая дзейнасьць у Маскве і іншых рэгіёнах імпэрыі. Зьнікаюць будаўнічыя фірмы, для якіх працавалі беларускія рабочыя. Рэжым у Менску

і ягоная псэўдаапазыцыя (Мілінкевіч і інш.) на працягу гадоў хваліліся, што „у Беларусі няма беспрацоўя". Яны, як быццам, „не заўважалі" амаль паўтара мільёна беларускіх мужчын, якія, ня маючы працы ў Беларусі, вымушаны былі ехаць на заробкі ў рабства ў Расею. Цяпер гэтыя паўтара мільёны мужчынаў вернуцца ў Беларусь з эканамічных руінаў Расеі. Будзе нарастаць сацыяльны пратэст, паглыбляцца крызіс дыктатарскага рэжыму, антынацыянальная палітыка якога прынесла столькі бедаў нашай Радзіме.

Выступілі таксама сябры Сойму з розных рэгіёнаў краіны. Пасьля правалу выбарчага фарсу структуры міліцыі і КГБ спрабуюць запалохаць і „прыцягнуць да адказнасьці" шэраг сяброў Фронту і Партыі. Але франтаўцы не паддаюцца на пагрозы і антызаконныя патрабаваньні структураў рэжыму, зьвяртаюцца з заявамі ў пракуратуру. Партыя не дапусьціць, каб у адносінах да нашых сяброў ужываліся незаконныя, брутальныя мэтады ўціску. Сябры Партыі адзначылі, што дзеячы і структуры падстаўной псэўдаапазыцыі падчас выбарчага фарсу паўсюдна прадэманстравалі сваю хлусьлівасьць, прадажнасьць і спрыяньне плянам рэжыму.

Людзі адэкватна ацанілі гэтую публіку і ейныя заклікі ісьці на выбарчыя ўчасткі псэўдавыбараў. Гэтыя дзеячыкі канчаткова страцілі свой твар, людзі адвярнуліся ад іх і іхнай фальшывай палітыкі, аплочанай ворагамі Беларусі. Аднак, беларусы са зьдзіўленьнем назіраюць, як адразу ж пасьля выбарчага фарсу гэтыя дзеячы зноў паехалі ў Брусэль і Берлін, каб зноў „прадстаўляць беларускі народ і апазыцыю". Яны рыхтуюць нават вялікую канфэрэнцыю „па будучыні Беларусі" ў Берліне, якую мяркуецца правесьці пад кіраўніцтвам разбуральніка нацыянальнай палітыкі Беларусі Ганса Віка і на нямецкія грошы (пры тым, што Вік публічна прызнаваўся, што мэтай ягонай асабістай дзейнасьці на пасадзе кіраўніка Менскай місіі АБСЭ зьяўлялася „уключэньне Беларусі ў больш дэмакратычную Расею". Неабходна тлумачыць людзям, што дзейнасьць гэтай правальнай публікі мае прыкметы нацыянальнай і дзяржаўнай здрады. Яны мала адрозьніваюцца ад дзеячаў рэжыму.

Сойм абмеркаваў пытаньні падрыхтоўкі і правядзеньня мерапрыемстваў на сёлетнія Дзяды.

***Інфармацыйная камісія***
***Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"***
***і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

*19 кастрычніка 2008 г.*

# СЬНЕЖАНЬСКІ СОЙМ

14 сьнежня сёлета ў Менску адбыўся чарговы Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. Сойм заслухаў выступ сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „Патрэбны новы народны рух" (публікуецца).

З дакладамі аб палітычным і сацыяльна-эканамічным становішчы выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў старшыні Партыі і Фронту на Беларусі, і сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Партыі і Фронту. Выступоўцы прадставілі факты глыбокага крызісу, у якім апынулася народная гаспадарка Беларусі. Спэцыфіка сістэмнага сусьветнага фінансава-эканамічнага крызісу ў тым, што здаровыя эканомікі выйдуць зь яго яшчэ больш моцнымі, пазбавіўшыся ад наносных утварэньняў і штучных зьяваў. А вось эканомікі, якія разьвіваліся па фальшывым шляху і насуперак нацыянальных інтарэсаў, будуць ахвярамі гэтага катаклізма. Адна з такіх – эканоміка Беларусі, створаная намаганьнямі прамаскоўскага рэжыму.

Нягледзячы на забароны і намаганьні афіцыёзнай прапаганды, з кожным днём становіцца ўсё больш зразумела, што рэжым завёў нашу краіну ў тупік. Людзей звальняюць з працы, зачыняюцца прадпрыемствы і фірмы, склады запоўнены незапатрабаванай прадукцыяй. Больш за палову беларускіх прадпрыемстваў зьяўляюцца банкрутамі. Гэта толькі пачатак разбуральных працэсаў. І што робіць рэжым у гэтай сытуацыі? ***Рэжым робіць усё наадварот.*** Завершана ліквідацыя дробнага беларускага бізнэсу, з вуліцаў нашых гарадоў зьніклі апошнія шапікі і лакальныя цэнтры гандлю. Такім чынам рэжым забясьпечыў драпежную манаполію вялікіх гандлёвых цэнтраў (гуртоўняў і крамаў), якімі валодаюць прадстаўнікі гэтага рэжыму або непасрэдна расейскія гаспадары. Яшчэ больш разбуральны характар маюць стратэгічныя дзеяньні прамаскоўскага рэжыму, які штучна прывязвае беларускую эканоміку да хворай эканомікі Расеі і беларускую фінансавую сістэму да правальнага расейскага рубля. Днямі пра гэта заявілі ў Маскве прэм'ер РБ Сідорскі і старшыня праўленьня Нацбанка РБ Пракаповіч. Яны назвалі працэс уключэньня беларускай фінансава-эканамічнай сістэмы ў расейскую сістэму найлепшай пэрспэктывай для Беларусі.

Паўстае пытаньне: ці гэтыя людзі некампэтэнтныя і не адпавядаюць прафэсійным патрабаваньням, ці яны наўмысна зьдзяйсьняюць акт нацыянальна-дзяржаўнага злачынства. Сапраўдным выйсьцем для Беларусі можа быць толькі арыентацыя на цывілізаваныя і высокаразьвітыя краіны, а не на Расею зь яе эканомікай, кантралюемай крыміналам. Стала вядома таксама, што нягледзячы на развал у расейскай эканоміцы, Крэмль працягвае фінансаваць імпэрскія акупацыйныя праграмы на Беларусі. Працягваецца будаўніцтва расейскага камбінату атрутных рэчываў у Пухавіцкім раёне непадалёк ад Менску. Разгортваецца будаўніцтва хмарачосаў у цэнтры Менску, дзе маскоўскі крымінал зьбіраецца стварыць свой цэнтар. ***У іх ужо гарыць імпэрскі дах у Маскве, а яны кідаюць велізарныя сродкі на захоп Беларусі.*** У Маскве зроблены таксама заявы пра пэрспэктыву рабскай працы на прасторах Расеі. Мяркуецца, што ў сувязі з крызісам з Расеі будуць выдалены таджыцкія і ўзбэцкія малакваліфікаваныя работнікі. Іхнае месца паводле крамлёўскага праекту павінны заняць сотні тысячаў высокакваліфікаваных беларусаў. Для гэтага Масква праз свой марыянэткавы рэжым будзе працягваць разбурэньне беларускай эканомікі і бізнэсу, каб беларусы ня мелі магчымасьці працаваць на радзіме. Беларускі народ павінен зразумець, што ***выратаваньне беларускай эканомікі і нашай краіны немагчымае пры існаваньні марыянэткавага рэжыму,*** які служыць інтарэсам чужой дзяржавы. Вырашэньне эканамічных праблемаў немагчымае без кардынальнага вырашэньня палітычных і сацыяльных праблемаў.

Выступілі таксама сябры Сойму з розных рэгіёнаў краіны. Яны канстатавалі, што ў большасьці людзей зьнік страх перад рэжымам. Беларусы ў адкрытую выказваюць свой пратэст супраць злачыннай палітыкі і ня вераць фальшывай прапагандзе. У шэрагу гарадоў адбыліся адмысловыя „паседжаньні працоўных". Мясцовыя ўлады і кіраўнікі прадпрыемстваў прымусова зьбіралі ў вялікіх залях тысячы людзей, якія ня ўдзельнічалі ў апошнім выбарчым фарсе рэжыму (бачна, што рэжым напалохаўся перамогі народнага байкоту). Перад людзьмі выступалі камісары і камісаршы з Менску. Яны заяўлялі: „Нехорошо, товарищи, что вы не пошли на выборы. Как же вы посмели? Как не стыдно?.." Камісарскія выступы абрывалі галасы сьмялейшых з беларускай грамады: „Вунь нас колькі тут – тысячы. Дык што вы тлуміце нам галовы? Дзе вашы 75%, што прагаласавалі на выбарах? Хлусы, колькі яшчэ будзеце дурыць нас! Людзі ня ўдзельнічалі ў вашай авантуры!" Пад сьмех публікі сталічныя камісары разам з мясцовымі начальнікамі вымушаны былі рэціравацца з прэзыдыюмаў. Зразумела, што рэжым рыхтуе чарговы выбарчы фарс і спрабуе разам з падстаўной псэўдаапазыцыяй загнаць людзей на выбарчыя ўчасткі. Але цяпер гэта зрабіць значна цяжэй.

Выступоўцы падкрэсьлівалі, што ва ўмовах крызісу прамаскоўскага рэжыму наш народ павінен праявіць нацыянальную салідарнасьць і самастойна, не спадзяючыся на чужую дапамогу або літасьць разбуральнікаў, ратаваць сабе і сваю краіну. Гэтым шляхам пайшлі нашыя суседзі, нацыянальныя дзяржавы, што вызваліліся з маскоўска-савецкага палону.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту***
***„Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі***
***– БНФ. (В. Буйвал)***

*14 сьнежня 2008 г.*




*Дэлегаты VIII Зьезду КХП –БНФ.*

# VIII ЗЬЕЗД КАНСЭРВАТЫЎНА-ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ПАРТЫІ – БНФ І X ЗЬЕЗД БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ „АДРАДЖЭНЬНЕ”

21 сьнежня ў Менску адбыўся VIII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і X Зьезд Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”. Зьезд заслухаў палітычны даклад сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ, – „Наперадзе вольная Беларусь” (тэкст публікуецца). Са справаздачнымі дакладамі выступілі намесьнікі старшыні Фронту і Партыі, сакратары Управы і кіраўнікі камісіяў. Былі абмеркаваны сытуацыя ў Беларусі і за яе межамі, вынікі і задачы дзейнасьці Фронту і Партыі. Выступілі таксама дэлегаты Зьезду з розных рэгіёнаў краіны, якія распавялі аб становішчы ў Беларусі і працы рэгіянальных арганізацыяў Фронту і Партыі. У адпаведнасьці са Статутам былі праведзены выбары Старшыні, намесьнікаў і Сойму Фронту і Партыі. Старшынём Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ быў абраны сп. Зянон Пазьняк. Намесьнікамі старшыні дэлегаты абралі сп. Юрыя Беленькага (выканаўца абавязкаў старшыні ў Беларусі) і сп. Сяргея Папкова. Быў таксама абраны Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ у складзе 35 сяброў. Заля, у якой адбываўся Зьезд, была ўпрыгожана нацыянальнымі Бел-Чырвона-Белымі сьцягамі і выявамі гэрбу „Пагоня”. Працу Зьезду дэлегаты распачалі і завяршылі сьпяваньнем гімну „Магутны Божа”.

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В. Буйвал)***

*21 сьнежня 2008 г. Менск*

# АБ НАКІРУНКАХ ПАРТЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ

***(Рэзалюцыя 8-га Зьезду Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ)***

Заслухаўшы палітычны даклад Старшыні Партыі, справаздачныя даклады намесьнікаў старшыні і выступы дэлегатаў, Зьезд пастанаўляе:

– У ацэнках дзеяньняў, мэтадаў і накірункаў дзейнасьці ўлічваць спэцыфічныя антыбеларускія абставіны і прамаскоўскую русіфікацыйную палітыку антыдэмакратычнага рэжыму на Беларусі . – Прызнаць станоўчай працу кіраўніцтва Партыі, Сойму і ягоных ворганаў. Асабліва адзначыць дзейнасьць па будаўніцтве, ахове і разьвіцьці Народнага Мэмарыялу Курапаты. Лічыць неабходным працягваць гэтую працу як прыярытэтную культурна-асьветніцкую задачу Партыі. – Лічыць правільнай і палітычна выверанай пазыцыю Партыі па байкоту галасаваньня на парляманцкіх выбарах 2008 года. – Лічыць важнай задачай працягваць нацыянальна-асьветніцкі і палітычна-прапагандысцкі накірункі ў дзейнасьці партыйнай арганізацыі. Шукаць новыя формы, мэтады і падыходы ў прапагандзе нацыянальна-дэмакратычных адраджэнскіх ідэй. – Лічыць галоўным накірункам у палітыцы Партыі змаганьне за непарушнасьць суверэнітэту і вольную Беларусь на грунце Беларускай Нацыянальнай ідэі, за дзяржаўны статус беларускай нацыянальнай сымволікі: Бел-Чырвона-Белага сьцяга і гэрба Пагоня, за дзяржаўны статус беларускай мовы і культуры, за нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы людзей, за справядлівасьць і дэмакратыю. Перад пастаяннай пагрозай для беларускай незалежнасьці з боку Расеі Беларуская Нацыянальная ідэя ёсьць тая аб’ядноўчая сіла, якая кансалідуе грамадзтва на змаганьне супраць пагрозы дзяржаве, на стваральную працу, на барацьбу за волю і лепшую долю вялікага Беларускага народа. *21 сьнежня 2008 г., г. Менск.*

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***

# НАПЕРАДЗЕ ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

*(Даклад на VIII Зьезьдзе Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Х-м Зьезьдзе Беларускага Народнага Фронта „Адраджэньне”)*

Паважаныя спадарыні і спадары, шаноўныя дэлегаты Зьезду! Вітаю Вас у Бацькаўшчыне, у найлепшай краіне, якая ёсьць на сьвеце!

Калі я думаю пра гэта – уся наша гісторыя паўстае прад вачыма. Пакаленьнямі йдзе змаганьне, каб адрадзіць яе веліч і вольную моц. Крок за крокам, стагоддзямі гінулі лепшыя людзі, крок за крокам набліжаемся мы да мэты.

Думаньне пакаленьнямі мусіць быць ня толькі ў ацэнцы гісторыі, але і ў разуменьні будучыні народа. У сьведамасьці грамадзяніна нацыі мінулае, цяперашчына і будучыня народа суіснуюць адначасна. Гэтакай асобай вызначаецца нацыянальны ўзровень грамадзтва. Ва ўсе часы і пры любых умовах трэба спрыяць, каб была, узьнікала і разьвівалася такая асоба. З гэтага гледзішча ідэалёгія і дзейнасьць Народнага Фронту цалкам адпавядае натуральнай патрэбе існаваньня і разьвіцьця нашай краіны.

Сёлета надышло некалькі круглых угодкаў нацыянальных падзеяў. Вясной мы адзначалі 90-годдзе аб’яўленьня незалежнасьці БНР, летам – 20 гадоў адкрыцьця Курапатаў, восеньню – 20-годдзе першага масавага грамадзкага адзначэньня „Дзядоў” у Менску і першага сілавога сутыкненьня з капэесэсаўскім рэжымам на Беларусі. Нарэшце, 19 кастрычнака гэтага года споўнілася 20 гадоў Беларускаму Народнаму Фронту „Адраджэньне”.

Беларускія асяродкі ў Беларусі ў меру магчымасьці, улічваючы антыбеларускія абставіны рэжыму, адзначылі гэтыя даты і ацанілі іх агульнанацыянальнае значэньне. На гэтыя тэмы зьявілася каля дзясятка публікацыяў у друку і Сеціве. Практычна, усе яны падрыхтаваныя сябрамі нашай Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі Фронту. Рэжымная навука (як, зрэшты, і індывідуальныя дасьледчыкі) пазьбеглі пісаць пра гэтыя ўгодкі. Але яно можа й добра – менш глупстваў, некампэтэнцыі, безадказнасьці, фальшу і няпраўды трапіла на старонкі друку.

Мушу сказаць, што абарона і выяўленьне гістарычнай праўды ў антыбеларускіх абставінах – гэта таксама чын вялікага значэньня, асабліва ўлічваючы этнацыд і антыкультурную палітыку рэжыму.

З цягам часу значэньне гістарычнай працы ўсё больш узрастае. Мы, адраджэнцы, павінны своечасова гэта ўсьведамляць. Бо нават з упадкам рэжыму на Беларусі заўсёды знойдуцца аматары наплюваць у народную мінуласьць, утахціць у гразь дзеяньні і людзей, што змагаліся за Беларусь, за волю супраць Масквы, расейскай агрэсіі і рускага імпэрыялізму.

Наша Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ ажыцьцяўляе працяг справы Народнага Фронту, той справы, якая прывяла нашу краіну да незалежнасьці і суверэннай беларускай дзяржавы. Гэта значыць, што мы робім і плянуем такую палітыку, якая зыходзіць з нацыянальных інтарэсаў, адпавядае патрэбам людзей, спрыяе умацаваньню і разьвіцьцю беларускай дзяржавы, беларускай мовы і беларускай культуры.

Уплыў дзейнасьці, палітыкі і ідэалёгіі Фронту быў найбольшы ў першай палове 90-х гадоў. Дамогшыся незалежнасьці, але ня маючы ўлады, Фронт, тым ня менш (дзякуючы найперш свайму дзейснаму дэпутацкаму авангарду ў Вярхоўным Савеце), найбольш паспрыяў сістэмнаму і структурнаму стварэньню незалежнай беларускай дзяржавы. Дэпутацкая Апазыцыя БНФ у Вярхоўным Савеце ставіла ў першую чаргу задачы арганізацыі сістэмы і чыньнікаў улады, якія забясьпечваюць, выяўляюць і гарантуюць дзяржаўны суверэнітэт Беларусі. Гэта найперш – ***нацыянальныя сымвалы***, ***нацыянальнае войска***, ***нацыянальнае грамадзянства***, ***нацыянальныя грошы (банкаўскія і фінансавыя сістэмы), нацыянальнае прадстаўніцтва за мяжой (амбасады).*** Усё гэта было дасягнута пры падтрымцы грамадзтва ў вельмі жорсткай барацьбе з савецка-камуністычнай прамаскоўскай намэнклятурай, якая (яшчэ раз нагадаю) трымала ў сваіх руках усю выканаўчую ўладу і мела пераважную („падаўляючую”) бальшыню ў Вярхоўным Савеце. Аднак заканатворчая перамога і тут сталася на баку дэпутацкай Апазыцыі БНФ. (Ізноў жа, нагадаю, гэта ня быў цуд, ня містыка, а вельмі дакладна распрацаваная палітыка і тактыка дэпутатаў-франтаўцаў, іхняя арганізаванасьць, умелае выкарыстаньне часовай няўпэўненасьці і ваганьняў намэнклятуры.

З канца 1992 года (пасьля кансалідацыі савецкай рэакцыі з Масквой і ўключэньнем КГБ у намэнклятурную палітыку на Беларусі) барацьба ўскладнілася і перакінулася на ўсю краіну. Пэрыяд кебічаўскай рэакцыі (1993-1994) быў вельмі цяжкім, але спыніць незалежнасьць і нацыянальнае разьвіцьцё Беларусі непрыяцелям беларушчыны не ўдалося. Ідэі Фронту тады ўжо глыбока паўплывалі на перадавую частку грамадзтва. Разьвівалася беларуская школа і беларуская навука, тэатр і мастацтва, хутка ўзьнялася беларуская гістарычная навука, пазбаўляючыся ад рэпрэсіяў і фальсіфікацыяў, друкаваліся беларускія кніжкі. У вуснах людзей, нават незаўважна для іх, зьяўляліся нармальныя франтаўскія азначэньні рэчаіснасьці, нармальныя беларускія думкі ў галаве (замест каляніяльна-савецкага бязладдзя паняцьцяў).

Унутраная акупацыя, прывядзеньне да ўлады Лукашэнкі і кантроль маскоўцаў над ключавымі пазыцыямі ўлады ў Беларусі зьмянілі сацыяльны парадак у беларускім грамадзтве. На паверхню ўлады і ўвогуле кіроўных ды прадстаўнічых сфэраў дзяржавы ўсплылі прымітыўныя, малакультурныя людзі з мэнтальнымі дэфэктамі, нізкім узроўнем думаньня і паводзінаў. Пашыраецца хамства, бескультур’е, бяздушнасьць, беларусафобства. Усё гэта выявілася ў вярхах рэжыму і, адпаведна, глыбока пранікла і справакавала ўсё грамадзтва.

***Абніжэньне культурнага ўзроўню грамадзтва – бадай што найбольш разбуральны вынік антыбеларускай улады і аўтарытарнага рэжыму на Беларусі.*** Я кажу „бадай што найбольш”, бо такое адразу і хутка не выпраўляецца. Спатрэбіцца доўгі час, і толькі пры ўмове мэтанакіраванай культурнай палітыкі (пачынаючы са школы і выхаваньня) можна будзе ў прынцыпе паправіць стан культуры грамадзтва да лепшага.

Прамаскоўскі рэжым заблякаваў ня тое што ідэі БНФ, а ўвогуле выключыў усё жывое, беларускае з рэжымнай палітыкі і афіцыйнага ўжытку, ізаляваў школу і адукацыю, уводзячы ўзамен русіфікацыю і пакланеньне перад Масквой. У гэтым становішчы адраджэнская палітычная сіла павінна была ўзяць на сябе адначасна і функцыі нацыянальна-асьветніцкай арганізацыі. Фактычна, з такой „сінкрэтычнай” дзейнасьці і пачынаўся Народны Фронт за саветамі. Былі тыя ж праблемы, хіба што толькі па форме татальная русіфікацыя тады не праводзілася так па-хамску, адкрыта і груба, а заўсёды ілжыва пад прыкрыцьцём „будаўніцтва камунізму”, стварэньня „новой общности *„советский народ”* і г.д.

У Народным Фронце ад пачатку ўсе разумелі, што перш чым весьці зь людзьмі палітычны дыялёг, трэба, каб існаваў дыялёг культурнай тоеснасьці. Тоеснасьць была парушана і папсавана саветамі, і тады Фронт узяў на сябе (адначасна з палітычнай) функцыю асьветніка і „будзіцеля”. Цяпер, ва ўмовах унутранай акупацыі і новай русіфікацыі грамадзтва, нацыянальна-культурнае і палітычнае асьветніцтва стала абавязковым зьместам нашай адраджэнскай дзейнасьці.

Мы зноў абнавілі яе больш-менш сістэмна ў гэтых цяжкіх умовах, пачынаючы з 2000 года. ***Уплыў нашай працы на тыя сфэры, куды яна накіраваная, ёсьць ідэёва заўважальны.*** Асабліва хачу адзначыць папраўу разуменьня ў грамадзтве палітыкі Расеі ў дачыненьні да Беларусі і ў цэлым у сьвеце. Нашай палітычнай тэрміналёгіяй (дзесяцігадовай даўнасьці) цяпер пачалі паўсюдна карыстацца ня толькі крытычна думаючыя вольныя людзі і нядаўнія непрыймальнікі элемэнтарных фактаў, але нават асобы, якія раней над палітыкай не задумваліся.

Культурна-асьветніцкая і палітычная праца ў сфэры ідэй, накіраваная на грамадзтва, не дае імгненнага выніку. Патрэбны час (асабліва ўлічваючы афіцыйную контрпрапаганду і апартуністычную дзейнасьць падстаўной апазыцыі). Гэта добра відаць на прыкладзе разьвіцьця ідэі байкоту фальшывага галасаваньня.

Ідэя байкоту рэжымных выбараў узьнікла ў Фронце пасьля фальсіфікацыйнага і незаконнага рэфэрэндуму 14 траўня 1995 года. Стала выразна бачна, што ва ўладзе замацавалася прарасейская хунта і ад грамадзтва адабралі магчымасьць кантролю за галасаваньнем. У 1996 годзе, калі рэжым рыхтаваў антыканстытуцыйны пераварот і чарговы незаконны рэфэрэндум па зьмене Канстытуцыі, пытаньне байкоту было пастаўлена зноў, але не даведзена да канца. Сытуацыя тады яшчэ не сасьпела ў грамадзтве ды і ў самым Фронце. Былі людзі, што не разумелі сутнасьці падзеяў, якія

плянаваліся рэжымам і адбываліся ў іх на вачах (пазьней гэтыя асобы вылучыліся ў „прагматыкаў").

З 2000 года пытаньне палітычна абвастрылася, бо ў канцы 1999 года рэжым Лукашэнкі і Масква стварылі небясьпечны антызаконны фантом – аб'явілі антыканстытуцыйную так званую „саюзную дзяржаву" нібыта Беларусі і Расеі, і Расея пачала ствараць пад яе прыдуманыя структуры.

Наступным этапам змоўшчыкі заплянавалі ўвядзеньне расейскіх грошай на Беларусі. Усе гэтыя пляны па ліквідацыі беларускай незалежнасьці меркавалі замацаваць у так званым „канстытуцыйным акце" фантомнай „саюзнай дзяржавы", які плянавалі прыняць на рэфэрэндуме.

Антынародны плян затармазіўся па адной прычыне: змоўшчыкі ня могуць дамовіцца аб уладзе, аб тым, хто будзе кіраваць фантомам СД (а фактычна, – Крамлём і Расеяй). Беларусы апынуліся ў закладніках гэтых гэбоўскіх авантурыстаў, а правядзеньне любых выбараў пры наяўнасьці машыны фальсіфікацыі стала цяпер небясьпечнай справай, бо змоўшчыкі могуць у кожны час далучыць да іх (на законнасьць тут ужо ніхто не зважае) рэфэрэндум аб „канстытуцыйным акце" СД.

Запабегчы рэалізацыі гэтай авантуры пры бессэнсоўнасьці галасаваньня можа толькі байкот галасаваньня. З гэтага часу мы пасьлядоўна разьвіваем канцэпцыю байкоту выбараў у Беларусі, якія з-за фальсіфікацыяў і адлучанасьці людзей ад кантролю над галасаваньнем сталі небясьпечнамі для грамадзтва і на якіх Расея магла б рэалізаваць свае анэксійныя пляны (асобна мы разглядаем прэзыдэнцкія выбары, але і тут магчымы байкот).

Нагадаю, што ў 2000 годзе, нягледзячы на процідзеяньне Нямеччыны і Эўразьвязу, нам удалося правесьці байкот у Менску. Першы тур выбараў у „палатку" праваліўся. Людзі не пайшлі галасаваць. Другі тур рэжым, ратуючыся, панічна і груба сфальсіфікаваў. Але ўдар быў нанесены. Шмат у каго расплюшчыліся вочы.

Пасьля 2000 года супроцьдзеяньне байкоту стала выразна акцэнтаваным з боку рэжыму, з боку падстаўной „апазыцыі" і з боку Заходняй Эўропы. У Эўразьвязе дамінавалі немцы, і нямецкая дыпляматыя праводзіла палітыку, узгодненую з Расеяй і накіраваную на ліквідацыю беларускай незалежнай дзяржавы. Усё гэта рабілася пад выглядам барацьбы з „дэфіцытам дэмакратыі" у Беларусі, якую павінна была дапамагчы дэмакратызаваць нібыта „дэмакратычная" ўжо Расея, і з гэтага гледзішча „аб'яднаньне" Беларусі з Расеяй немцы лічылі станоўчым намерам. Пэўныя нямецкія колы, па ўсім відаць, уважалі, што ліквідацыя беларускай незалежнасьці была б геапалітычна і эканамічна выгаднай для Нямеччыны.

У час сэрбскага крызісу ў верасьні 2000 года на міжнароднай канфэрэнцыі ў Беластоку Ганс Вік прагаварыўся, што яго дзейнасьць у Менску на пасадзе старшыні Місіі АБСЭ была накіравана на падрыхтоўку ўваходжаньня Беларусі ў склад Расеі. Зразумела, што пасьля байкоту 2000-га года „эўрадэмакратызатары" паказалі менскай падстаўной апазыцыі кулак (некаторыя зь іх удзельнічалі тады ў байкоце) і ў чарговы раз пастрашылі спыненьнем фінансаваньня. Пасьля гэтага падстаўныя па сёньняшні дзень і слухаць ня хочуць пра байкот – так стала ім страшна.

Тым часам наша пасьлядоўная пазыцыя, асьветніцтва і тлумачэньні не засталіся страчанымі. Само жыцьцё паказвала людзям слушнасьць нашых ацэнак. Пералом настаў у гэтым годзе. Паўсюдна на Беларусі людзі не пайшлі галасаваць, нягледзячы на прымус рэжыму і лямант заганяльшчыкаў ад падстаўной апазыцыі. Рэжым груба праваліўся і груба сфальсіфікаваў вынікі, бо заявілі пра 75 адсоткаў прагаласаваных, і гэта ў той час, як усе бачылі пустыя выбарчыя ўчасткі ў дзень галасаваньня.

Выбары не былі прызнаныя міжнароднай супольнасьцю за дэмакратычныя, улічваючы ўвесь комплекс парушэньняў. Факт байкоту быў, аднак, прыглушаны, змікшыраваны ў існуючай прапагандзе рэжыму і ў Эўропе. Там і тут стараюцца пра байкот не ўспамінаць. Але нас гэта мала абходзіць, бо мы бачым, што адбываюцца істотныя зьмены ў настроях грамадзтва: людзі пазбаўляюцца страху і перастаюць баяцца. Пасыўны байкот восеньскіх выбараў у рэжымную „палату" ёсьць гэтаму пацьвярджэньне. Наша праца над палітычнай асьветай і адносінамі людзей да фальшывых выбараў будзе прадоўжана.

У апошнія два справаздачныя гады наша Партыя працавала па сваіх асноўных палітычных накірунках: ***нацыянальна-асьветніцкім***, ***абароны дзяржаўнасьці і суверэнітэту***, ***запабяганьня і недапушчэньня рэфэрэндуму аб так званым „канстытуцыйным акце" СД***, ***крытыка і выкрыцьцё антыбеларускай палітыкі рэжыму***, ***дзеяньні і акцыі супраць русіфікацыі***, ***выкрыцьцё этнацыду***, ***падтрымка і будаўніцтва Народнага мэмарыялу Курапаты***, ***падтрымка і ўшанаваньне нацыянальных сьвятаў, падзеяў, юбілеяў, сакральных асяродкаў і традыцыяў***.

Аглядаючы гэтыя накірункі дзейнасьці, можна вылучыць некалькі акцыяў і працаў, якія мелі істотнае значэньне ў змаганьні з рэжымам. Тут адзначу найперш **акцыю *„Аб адказнасьці за фальсіфікацыю прэзыдэнцкіх выбараў 2006 года"***. Сойм КХП-БНФ 10 сьнежня 2006 г. прыняў пастанову „Аб пытаньні ўзбуджэньня крымінальнай справы па факту фальсіфікацыі выбараў". Пастанова была прынятая на падставе відэазапісу публічнага прызнаньня Лукашэнкі аб фальсіфікацыі выбараў 2006 года. Іскавая ініцыятыва і дачыненьні з Вярхоўным Судом і Пракуратурай Рэспублікі Беларусь доўжыліся некалькі месяцаў, ускрылі ахоўніцкі зьмест юрыдычнай сістэмы рэжыму. Справа стала дакумэнтальнай ілюстрацыяй несвабоднай сутнасьці гэтай сістэмы.

Вялікай справай нашай Партыі ёсьць стварэньне Народнага Мэмарыялу Курапаты, догляд за ім і далейшае разьвіцьцё. Вясной мінулага года пасьлядоўнікі ворагаў чалавецтва зрабілі нечуванае злачынства – зламалі Курапацкі сакральны Крыж Пакуты. Належыцца вялікая падзяка сябрам нашай Партыі, Курапацкай Камісіі і Управе за хуткую рэстаўрацыю і аднаўленьне Сьвятога Кража (якая вымагала ўменьня, арганізацыі і тэхнічных затрат). У гэтым годзе, улічваючы ўзмацненьне арганізаванага вандалізму, сябры нашай Партыі наладзілі ахову Курапатаў. У выніку былі нарэшце злоўленыя вандалы, распачатая крымінальная справа. З цягам часу мы выкаранім ня толькі вандалізм на сьвятым месцы, але і выявім яго канкрэтных арганізатараў і натхняльнікаў.

Вельмі станоўча трэба адзначыць **акцыю *„Асіміляцыя – злачынства супраць чалавецтва"***, якая доўжылася на працягу ўсёй другой паловы 2007 года. Было апавешчана больш тысячы дзяржаўных чыноўнікаў і кіраўнікоў. Партыя зрабіла патрэбную і карысную справу. Акцыя часова перапыненая, аднак, яшчэ не закончылася. Прынцып такіх дзеяньняў з адрасным пасылам інфармацыі трэба будзе аднавіць у наступным годзе. Тэматыка шырокая.

Цяпер, ва ўмовах сусьветнага эканамічна-фінансавага крызісу, выяўляюцца новыя тэндэнцыі ў палітыцы. Найбольш небясьпечныя зрухі назіраюцца ў Расеі. Зьніжэньне цаны за нафту паралізавала асноўныя даходы гэбоўскай карпарацыі ўлады. Спыняецца вытворчасьць, растуць цэны і беспрацоўе, паралізуецца гандаль і фінансавая сістэма. Гэбоўская і іншая маёмная алігархія вывозіць свае капіталы на Захад. Складваецца ўражаньне, што ніхто там не імкнецца эканамічна ратаваць Расею – ратуюць све грошы і ўладу.

Аналіз і вопыт паказваюць, што гэбоўская карпарацыя, якая захапіла ўладу ў Расеі, будзе чапляцца за яе з усіх сілаў і пойдзе на любыя ахвяры, каб затрымацца ля кіраўніцы. У становішчы крызісу і пры пагрозе для ўлады у Расеі расейская ўлада (каб захавацца) заўсёды выкарыстоўвае некалькі стандартных прыёмаў. Тыповыя захады Масквы ў гэтым выпадку: рэпрэсіі, тэрор альбо вайна (пажадана „маленькая" і „пераможная), знаходжаньне зьнешняга ворага, каб пераключыць імпэрскую мэнтальнасьць насельніцтва на змаганьне з „ворагамі Расеі" і гэтым (вайной) растлумачыць і апраўдаць жыцьцёвыя цяжкасьці людзей.

Ёсьць прыкметы, якія паказваюць на разьвіцьцё падзеяў якраз у ваенным накірунку. Гэта падрыхтоўка да нечарговых выбараў прэзыдэнта ў 2009 годзе (вяртаньне на пасад Пуціна), абвастрэньне вайсковай сытуацыі на Каўказе і прадажа (праз рэжым Лукашэнкі) сучасных ракетаў С-300 Ірану, што ў корані зьмяняе абставіны ў гэтым месцы і падводзіць Ізраіль і ЗША да мяжы вайны (узрастае неабходнасьць прэвентыўнага ўдару па ядзерных аб'ектах Ірану).

Разьвіцьцё такіх падзеяў можа вельмі некарысным чынам адбіцца на палітыцы ў дачыненьні да Беларусі (жыцьцёвыя інтарэсы Беларусі могуць стацца аб'ектам міжнародных маніпуляцыяў). Мы мусім мець гэта на ўвазе ў сваіх аналізах і плянаваньні партыйнай палітыкі, фактычна, – палітыкі Адраджэньня.

Агрэсія Расеі супраць Грузіі, сусьветны фінансавы крызіс спрычыніліся да карэкцыі палітыкі Эўразьвязу ў дачыненьні да рэжыму Лукашэнкі. І тут адкрыта выявілася тое, што было вядома ад пачатку – службовая (несамастойная) функцыя падстаўной „апазыцыі". Палітычны правал на

выбарах (народ не пайшоў галасаваць за псэўдаапазыцыю) і адносіны Эўразьвязу, які павярнуўся тварам да Лукашэнкі, паказалі на сапраўднае месца гэтай публікі: альбо на сьметніку, альбо ў прыхожай рэжыму. Некаторыя (як так званая „Аб'яднаныя дэмсілы") ужо засьведчылі, што хочуць у прыхожую, нават праграму і петыцыю напісалі ды адаслалі Лукашэнку.

Тым часам у Расеі, рыхтуючыся да абароны ўлады ў часе крызісу, Лубянка распусьціла ўсе свае агентурная партыі „апазыцыі", якія панастварала (так званы „Саюз правых сілаў"), і сфармавала „Правое дело", якое супрацоўнічае з Крамлём і атрымлівае ад яго пасады. Тактыка зразумелая. У час магчымага грамадзкага абвастрэньня крамлёўцы ня хочуць мець ніякага (нават квазіапазыцыйнага) піску супраць Крамля. Ім трэба, каб зьява пад назвай „апазыцыя" „пішчэла" за Крэмль і гэтым самым тушыла б спробы антыўладнай кансалідацыі ў Расеі.

Выглядае, што па такім жа сцэнары хочуць пераліцаваць падстаўную апазыцыю і ў Беларусі (адна кантора – адны манеры). Акрамя гучаньня „прасіцеляў" рэжымных пасадаў з АДС і АГП пачалі зьяўляцца цяпер публікацыі ў афіцыйным і незалежным друку розных „аналітыкаў" ды параднікаў. Агентура пад псэўданімамі і без псэўданімаў піша ды прапануе гэтай псэўдаапазыцыі Калякіных-Лябедзек зноў падацца на службу да рэжыму, так бы мовячы, стаць „канструктыўнай псэўдаапазыцыяй" і супрацоўнічаць з нішчыцелямі народу. Мяркую, што яны, хутчэй за ўсё, пераліцуюць сябе, як старое паліто. Але вельмі цікава будуць выглядаць тады нашы прагматыкі з былога БНФ. Відаць, трэба ўсё ж час ад часу чытаць клясыкаў беларускай літаратуры, каб не прышлося выбіваць нагой табурэтку пад шыбеніцай Беларусі.

2008 год стаў падсумоўкай і наглядным сьведчаньнем краху так званых „прагматыкаў" ў палітыцы, людзей, што на этапе змаганьня захацелі спалучыць грамадзкія і прыватныя інтарэсы, палітычную барацьбу і асабістую выгаду ад гэтай барацьбы. У выніку – палітычны тупік. Бо барацьба патрабуе ахвярнасьці, а ня выгады.

Тым часам у беларускім грамадзтве ідуць павольныя глыбінныя перамены, якія ў сувязі з крызісам могуць абвастрацца. Галоўная сутнасьць гэтых яшчэ часам схаваных глыбінных пераменаў у сьведамасьці беларусаў – гэта незадаволенасьць рэжымам і яго начальнікам; другое, як я ўжо адзначыў, – гэта пазбаўленьне ад страху і ад неадэкватнай ацэнкі расейскай палітыкі і, нарэшце, самае істотнае: у людзей намячаецца паварот да беларускага, да свайго.

Перамены, урэшце, павінны будуць пераўтварыцца ў рэальныя формы. Наша задача, абапіраючыся на ініцыятыву „Беларуская Салідарнасьць", паскорыць і канкрэтызаваць глыбінныя працэсы грамадзтва, падрыхтаваць і прапанаваць узбуджанаму народу ідэі і пэрспэктывы, якія выльюцца ў новы Беларускі Народны Рух, у сілу, якая разбурыць дыктатуру і прамаскоўскі рэжым, ліквідуе бяспраўе і зьдзек, этнацыд і беларусафобства, рабаўніцтва людзей і хлусьню, фальш і саветчыну і верне ўсіх у Беларусь, у харошую нашу краіну, у народную нашу дзяржаву.

*21 сьнежня 2008 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# „ТОВАРІШЧІ, ВСЁ ДЕЛАЕТСЯ ДЛЯ СТАБІЛЬНОСТІ"...

2 студзеня прамаскоўскі рэжым наладзіў усім беларусам рэзкае працьверазьвеньне пасярод навагодніх сьвятаў. Абрынуўся курс беларускага рубля. Натоўпы грамадзянаў штурмуюць абменьнікі, пазбаўляючыся ад рублёў, а таксама крамы, дзе яны выкупляюць дарагія тавары (тэлевізары, адзеньне, электроніку). У шэрагу крамаў адбыліся тэмпэрамэнтныя бойкі паміж пакупнікамі за тавар. Людзі набывалі па 2-3 лядоўні, па 20 патэльняў і г.д. Усе ведалі, што ў бліжэйшыя дні рэзка падскочаць цэны на ўсе тавары ў крамах (на рынках цэны ўжо падскочылі). На правінцыі тысячы людзей узялі прыступам мясцовыя крамы і выкупілі ўсе запасы мукі, макаронаў, крупаў, запалак і мыла (тыповы ваенны нацюрморт). Усё адбылося так рэзка, што нават былы банкір Багданкевіч прызнаўся па Радыё Свабода, што не чакаў такога тэмпу абвалу. На прыканцы сьнежня Лукашэнка лётаў быў у Маскву, сустракаўся з крамлёўскімі начальнікамі. Афіцыёз не даваў ніякой інфармацыі пра тое, аб чым яны там „беседовалі" (любімае гэбоўскае слоўца). Цяпер усім зразумела, што Масква дала адмашку на абвал нацыянальнай валюты Беларусі. На экранах тэлевізараў зьявілася гладкая фізіяномія з Нацбанку РБ і патлумачыла, што адбываецца: „Товарішчі, мы повысілі на 15% ставку рефінансірования. Всё это для того, чтобы прівлечь наших граждан делать банковскіе вклады в белорусскіх рублях. Всё делается для стабільності, для блага человека…" Гэта быў самы пацешны эпізод пасярод чарговага акту беларускай драмы.

***Янка Базыль***

# НОРАВЫ РЭЖЫМУ

### *Міліцыянты правяраюць, ці ёсьць у кватэрах забароненая літаратура*

Праваабаронца з Баранавічаў Сяргей Гоўша паведаміў „Свабодзе", што ў ягоную кватэру спрабаваў уварвацца міліцыянт: „Я быў у іншым месцы, калі патэлефанавала жонка і паведаміла, што ў дзьверы нехта грукае, кажа, што ён зь міліцыі, і патрабуе ўпусьціць у кватэру. Тут я падыходжу. Бачу, што гэта капітан міліцыі Бахарэвіч. Пытаюся, што ён хоча. У адказ заяўляе, што атрымаў загад начальства праверыць, ці ёсьць у мяне на кватэры забароненая літаратура. Патрабую ў міліцыянта дазвол пракурора на вобшук. Такога дакумэнту ў яго няма."

### *Штраф за «незразумелую мову»*

Прадпрымальніку з рынку «Ждановічы» Алесю Таўстыку далі 140 тысяч рублёў штрафу за тое, што ён… размаўляў на беларускай мове.

– Нібыта нейкая жанчына напісала на мяне скаргу ў абласную падатковую інспэкцыю, што я размаўляю з пакупнікамі на незразумелай мове, – распавядае прадпрымальнік. – «Незразумелая мова», наколькі я зразумеў, гэта беларуская, на якой я заўсёды размаўляю. Скаргу перадалі ў раённую падатковую інспэкцыю, але азнаёміцца мне не далі. І прысудзілі мне штраф – 140 тысяч рублёў. Па нейкіх там правілах яны маюць права прымаць такія рашэньні. Аргумэнтацыя была такая: маўляў, за некарэктную размову з пакупніком. Хоць тая жанчына наогул у мяне нічога не купляла. Проста прыйшоў чалавек, які пачаў лаяцца і абражаць мяне. Калі б гэта быў мужчына, дык я зь ім увогуле па-іншаму пагутарыў бы…

А. Таўстыка – адзін зь лідэраў прадпрымальнікаў, арыштоўваўся за сваю палітычную дзейнасьць.

***(Паводле: Алесь Сьвятланіч, Народная воля)***

# ПАТРЭБНЫ НОВЫ НАРОДНЫ РУХ

### *(Выступ на сьнежаньскім Сойме Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне". Скарочана)*

**…**Апошнія два гады мінулі ў вельмі неспрыяльных для Беларусі абставінах. Рэжым практыкаваў татальныя рэпрэсіі супраць усяго беларускага, нішчыцелі спрабавалі забараніць і нашу Партыю, але гэта ім не ўдалося. І хоць наша фармальнае становішча пасьля рэпрэсіяў пагоршала (праблема памяшканьня, сувязі, сродкаў), але яно не спараджае няпэўнасьці. Наадварот, узрастае ўпэўненасьць. Бо мы адчуваем і назіраем вынікі нашай нацыянальна-асьветніцкай працы і перамогу нашай пазыцыі ў дачыненьні да рэжымных выбараў і рэфэрэндумаў. Я маю на ўвазе нашу канцэпцыю байкоту, якую грамадзтва, нарэшце, пачало ўспрымаць і ў гэтым годзе сваім няўдзелам дапамагло праваліць фальшывыя выбары. Іх ніхто не прызнаў, акрамя Масквы.

Хачу зьвярнуць Вашу ўвагу, што над праблемай байкоту антынароднай выбарчай сістэмы мы працуем ужо скора дзесяць гадоў. Першы станоўчы вынік, як вы памятаеце, быў ужо ў 2000 годзе, але толькі цяпер, у 2008-м, гэта наша пазыцыя праявілася ў грамадзтве як сістэмная зьява. Вы бачыце, што ёсьць сэнс у пасьлядоўнай канцэптуальнай працы. Урэшце рэшт яна



(Фота А. Мініца)

*Рэжымны краявід у Беларусі. („Лінія Сталіна” – зьява, якой не было).*

дае вынік. У прынцыпе, можна заблякаваць цалкам рэжымныя выбары, і рэжым пачне задыхацца. Патрэбная мэтанакіраваная праца. Але пакуль будуць існаваць штрайкбрэхеры ў выглядзе падстаўной апазыцыі, датуль будуць сур’ёзныя перашкоды ў нашым змаганьні з рэжымам. На ліквідацыю штрайкбрэхераў мы павінны будзем мабілізоўваць само грамадзтва.

Па маіх назіраньнях, маргінальная апазыцыя не існуе як сістэмная і колькасная палітычная сіла. Гэта пару дзясяткаў асобаў, якія сядзяць на замежных датацыях і знаходзяцца у Менску, генэралы бяз войска, самы стаяць у пікетах і самы раздаюць сумніўныя ўлёткі пра правы чалавека, напісаныя па-руску. Спыніць іхняе шкоднае існаваньне можна адным махам – перакрыць замежныя датацыі. Рэжым гэта ня робіць, бо яму лепш мець такую „падстаўку”, чымся сапраўды змагарны народны рух, праявы якога дыктатура імкнецца тут жа душыць.

Пра халуйства маргіналаў і поўзаньне перад Масквой мы пісалі ўжо шмат разоў, паказвалі іхныя імітацыі барацьбы і падлыжнасьць перад рэжымам. Але публіка не сарамлівая, і цынізму няма канца.

Нядаўна так званыя „Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы” напісалі пад кіраўніцтвам Ярасслава Раманчука „праграму” „Новы эканамічны курс” і накіравалі яе Лукашэнку *(радыё „ Свабода”, 11 сьнежня 2008 г.)*. У „праграме” яны прапануюць Лукашэнку скасаваць Савет Міністраў і стварыць узамен „групу антыкрызіснага кіраваньня” пры адміністрацыі прэзыдэнта, а кіраўніком гэтай „групы” просяць прызначыць аўтара „опуса”, гэта значыць Ярасслава Раманчука. Нават тэкст указу аб прызначэньні напісалі і накіравалі Лукашэнку (каб аблегчыць, значыцца, яго клопат).

Ну, што тут скажаш? Даўно вядома (яшчэ з часу спробы пабудаваць „пэрпэтум мобіле”), што агульны ўзровень ідыятызму ў рэжымнай Беларусі лунае на недасягальнай вышыні. Тут гэта заразная хвароба, інфэкцыйнае захворваньне. Вось гэта „дэмсілы”! Вось гэта „апазыцыя”! Сама просіцца на службу да праклятага „дыктатара”. Але іх можна зразумець: „свабоды” няма, дык часам і лейтэнантам хочацца „паруляваць”.

Ліквідацыя падстаўной маргінальнай „апазыцыі” для нас даўно зразумелая задача. Толькі, як аказалася, гэта няпростая задача. Бо пакуль існуе рэжым, будзе і гэтая ягоная „апазыцыя”. Яна для яго як нялюбая жонка: днём яе лупіць і б’е, а ноччу сьпіць.

Падзеі ў Расеі, аднак (дзе Лубянка распусьціла ўсе свае так званыя „правыя апазыцыйныя партыі” і стварыла зь іх „Правое дело”, якое будзе супрацоўнічаць з Крамлём), нагадваюць, што аналягічныя перамены са статусам „падстаўной апазыцыі” ў прынцыпе магчымыя і ў Беларусі. Як бачым, так званыя „аб’яднаныя дэмсілы” ўжо імкнуцца ўвайсьці ў структуры антыбеларускага рэжыму (дакладней, хочуць вярнуцца туды, адкуль прыйшлі). Дарэчы, тут адчуваецца дырыжорская палачка з Масквы. Там расфармаваньне лубянскай „апазыцыі” ідзе поўным ходам, тамтэйшы „лідэр” „правых сіл” Мікіта Бялых ужо нават пасаду губэрнатара ад Крамля атрымаў.

Крызіснае становішча (маецца на ўвазе эканамічна-фінансавы сусьветны крызіс) абцяжарвае жыцьцё людзей, але адначасна стварылася лепшая кан’юнктура (праўда, пакуль нязначная) для змаганьня за патрэбы беларусаў і за інтарэсы Беларусі. Сытуацыя, аднак, у каторы раз пацьвярджае, што за Беларусь могуць рэальна і вынікова змагацца толькі людзі і сілы адраджэнскай накіраванасьці.

Антыбеларускі рэжым пачаў ў рэчышчы агульнага нацыянальнага нішчэньня ліквідацыю дробных прадпрыймальнікаў. Кожны адраджэнец разумее акупанцкі сэнс гэтай ліквідацыі (гэтак жа, як і ліквідацыю беларускай школы, мовы, сымволікі, саюзу пасьменьнікаў, беларускіх часопісаў, выдавецтваў, вёскі і сялянства і г. д.). Недаходзіць ён, гэты сэнс, толькі да прадпрыймальнікаў. Акупацыйная палітыка ўжо даўно занялася імі шчыльна і жорстка. Яны ж лемантуюць і паўтараюць, як заведзеныя, лёзунгі сваёй кіроўнай агентуры: „Ніякай палітыкі!” „Мы па-за палітыкай”! Нацыянальна сьляпы чалавек бывае неадэкватны ў паводзінах.

Гэтак жа неадэкватна паводзяць сябе розныя канфармісцкая групы. У гэтым годзе рэжым прыняў антыбеларускі закон супраць мовы – увёў свой рэжымны правапіс і юрыдычную адказнасьць за парушэньне рэжымнай артаграфіі. Да ўводу закона ў дзеяньне яшчэ больш чым паўтара гады. Яшчэ ёсьць час легальна пазмагацца за зьмены ў законе (як гэта правільна робяць А. Трусаў і ТБМ), пашукаць выхаду са становішча. Зрэшты, вымушанае падпарадкаваньне гвалтоўнаму закону дазваляе ўсё ж захаваць твар і, галоўнае, – пакінуць пратэст, сваю рацыю і магчымасьць барацьбы.

Не, канфармісты так ня робяць, яны йдуць здавацца заранёў з высока паднятымі ў гару рукамі. А потым будуць даводзіць, што ў гэтым і ёсьць іхныя прынцыпы.

Першай пайшла па такой дарожцы і адмовілася ад клясычнага правапісу рэдакцыя тыднёвіка „Наша Ніва”. Як кажуць, пайшлі на шыбеніцу са сваёй вяроўкай (памятаеце гэты трапны антыбеларускі анэкдот?).

У наступным годзе, адразу пасьля Зьезду, нам трэба будзе актывізаваць нашу ініцыятыву „Беларуская Салідарнасьць” з акцэнтам на нацыянальна-палітычную асьвету грамадзтва. Маргінальная апазыцыя, як бачым, можа існаваць толькі ў дэнацыяналізаваным балоце, дзе няма крытэрыяў, акрамя славаблудзтва. Перамена сьвядомасьці пераменіць абставіны. Гэта адзін аспэкт практычнага і крытычнага прыстасаваньня ініцыятывы. Другі аспэкт, які выяўляецца цяпер як грамадзкая патрэба, – гэта падрыхтоўка ідэйна-палітычнага грунту пад новы беларускі народны рух, які разгоніць маргінальную апазыцыю і пачне рэальнае змаганьне з прамаскоўскім рэжымам. (…)

*14 сьнежня 2008 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***

# ДОМ ГЕНЭРАЛА



(Фота з Сеціва)

*Генэрал С. Булак-Балаховіч.*

Выданьне „Вольнае Глыбокае” распавядае пра адкрыцьцё мясцовага краязнаўцы Эдманда Гірына. Ён высьветліў, што ў мястэчку Лужкі Шаркаўскага раёну дагэтуль захаваўся дом, дзе жыў слынны беларускі генэрал Станіслаў Булак-Балаховіч. Распавядае рэдактар Уладзімер Скрабатун: „Жыў ён там з 1904 па 1914 гады. І працаваў упраўляючым у графа Плятара. Гэтыя зьвесткі – не сакрэт, паўсюль напісана, што ён жыў у Лужках. Але невядома было, што дом гэты захаваўся. Вось у чым інтрыга і адкрыцьцё. І гэты краязнаўца, Эдманд Гірын, ён мае намер зрабіць з Лужкоў мястэчка-музэй пад адкрытым небам. Там сапраўды, у тых Лужках, вельмі шмат захавалася”.

***Юлія Рымашэўская***
***(Паводле радыё Свабода)***

# НАВІНЫ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ КУЛЬТУРЫ

28 сьнежня 2008 г. Румынская газэта „Adevarul" публікуе рэкляму свайго кніжнага выдаўніцтва, прапануючы чытачам купіць больш за 200 тытулаў сусьветнай літаратуры. Гэта выданьні румынскіх перакладаў Льва Талстога, Марка Твэна, Джэка Лёндана…

Наш камэнтар: Румынам ня сьнілася акупанцкае вычварэньне, якое наладзіла Масква ў беларускім літаратурным жыцьці за часы паняволеньня Беларусі. Нашу нацыянальную школу мастацкага і навуковага перакладу (адну з лепшых у Эўропе) расейскія акупанты грамілі кожны раз, як толькі зьяўлялася новае пакаленьне беларускіх інтэлектуалаў. Кароткі пэрыяд нармальнага разьвіцьця беларускай культуры ў 1990-94 гадах скончыўся чарговым пагромам. Краіна завалена маскоўскай макулатурай. Рэжым вымушае беларускія выдавецтвы друкаваць „русскоязычные" выданьні. Шэдэўры сусьветнай літаратуры дагэтуль не гучаць на беларускай мове. Сталічны „ін'яз" існуе (па-за рэдкім выключэньнем) як „кузьня кадраў" для русіфікацыі, гэбоўскай агентуры і інтэр-панэлі. Пасьля зьнікненьня антыбеларускага рэжыму гэтая ненармальнасьць будзе выдалена з нашага нацыянальнага жыцьця.

***Алесь Хадасевіч***

# „ГЭТА СТАЛА КАМЭРТОНАМ ДЛЯ ЗМАГАНЬНЯ З ІМПЭРЫЯЙ КПСС"

***Ганна Соўсь:*** *Заснавальнік Беларускага Народнага Фронту і адкрывальнік Курапатаў Зянон Пазьняк – пра першае масавае шэсьце 30 кастрычніка 1988 году.*

***Зянон Пазьняк****:* „На Дзяды 30 кастрычніка 1988 году, фактычна, адбылося першае выпрабавальнае сутыкненьне паміж сіламі таталітарнага імпэрскага СССР і новымі сіламі нацыянальнага вызваленьня. Ад зыходу гэтага сутыкненьня залежаў шлях, па якому пойдзе вызвольная барацьба ў Савецкім Саюзе. Камуністы хацелі навязаць крывавае вырашэньне канфлікту, каб задзейнічаць паліцэйскую ваенную сілу, якая ў іх была.
Таму ў ЦК кампартыі Беларусі была падрыхтаваная маштабная сілавая правакацыя і створаны камуністычны штаб правакацыі, які ўзначаліў сакратар ЦК па ідэалёгіі **Валер Пячэньнікаў**. Ён генэральна кіраваў апэрацыяй. З усёй Беларусі былі прывезеныя ў Менск аддзелы міліцыі, задзейнічана рэальна было каля 10 тысячаў чалавек. Былі перакрытыя ўсе дарогі на ўезьдзе ў Менск, у тым ліку Менская акружная дарога. Падняты Белполк і батальёны ўнутраных войскаў, частцы асабовага складу раздалі вогнестрэльную зброю і баявыя патроны. Да Ўсходніх могілкаў сьцягнулі мноства тэхнікі, якой менчукі яшчэ ніколі ня бачылі. Там было шэсьць вадамётных ваенных машын з вадзянымі гарматамі, машыны сувязі з рацыямі, мноства вялізных глухіх машынаў з закратаванымі вокнамі, аўтобусы з байцамі ў плястыкавых касках і каля двух дзясяткаў міліцэйскіх хапуноў. Курапаты таксама былі абкружаныя міліцыяй са шчытамі і з гумовымі палкамі. І хоць быў выходны дзень, 30 кастрычніка працавалі суды і пракуратура.

Каля могілак людзей пачалі труціць газам і хапаць. Тымчасам на могілках хадзілі міліцыянты з сабакамі. Усю масу людзей абкружылі і прыціскалі да могілкавай агароджы. Правакуючы, яны чакалі нейкай каманды. Зразумела, што трэба было вывесьці людзей з гэтых абцугоў.

Я пасьпеў прамовіць да ўсіх ня больш хвіліны і папярэдзіў, што рыхтуецца вялікая правакацыя, каб не паддаваліся на правакацыю і на бойку, каб трымаліся разам і каб выходзілі ў бок Уручча на Курапаты. Гэтым удалося зблытаць пляны правакатараў. Большая палова людзей пайшла на Курапаты, а частка засталася. Міліцыя падзялілася. Чуліся супярэчлівыя каманды і лаянка камандзіраў. Словам, правакацыя не ўдалася, хоць у той дзень зьбілі і арыштавалі больш за 70 чалавек.

Праз год мне стала вядома ад чыноў міліцыі, што намервалася людзей зьпіхнуць у стары сад, а там моцна пабіць, пусьціць кроў. Потым усю віну за гэта думалі ўзваліць на БНФ і расправіцца з Фронтам у зародку. У гэты



*30 кастрычніка 1988 года, мітынг у полі па дарозе на Курапаты.*

дзень мы перамаглі сваёй стрыманасьцю і арганізаванасьцю. Тут гандзісцкі мэтад змаганьня мірнымі сродкамі нам моцна дапамог. Плян камуністаў пацярпеў грандыёзны крах. У выніку пасьля 30 кастрычніка беларуская інтэлігенцыя, творчыя саюзы, навуковая грамадзкасьць адвярнуліся ад камуністаў. Паўтаруся, гэта была наша нечаканая, вялікая і разумная перамога. Пасьля 30 кастрычніка Фронт пачаў бурна разрастацца па ўсёй Беларусі. Неўзабаве мы ўжо мелі масавую арганізацыю падтрымкі людзей.

Гэтая падзея мела розгалас па ўсім СССР. Менавіта яна стала камэртонам для мірнага змаганьня зь імпэрыяй КПСС. Камуністы пасьля 30 кастрычніка і разгромнай паразы ў Менску зразумелі, што сілавы мэтад барацьбы з Народнымі Франтамі прывядзе іх да краху. У выніку барацьба за дэмакратыю і незалежнасьць пайшла ў СССР мірным шляхам. Калі б тады, у 1988-м, мы б паддаліся на правакацыю, то пасьля таго, як нас патапілі б у крыві, кроў палілася б па ўсім Савецкім Саюзе. Характар расейцаў мы добра ведаем".

*17 кастрычніка 2008*

***(Інтэрв'ю: Ганна Соўсь, радыё Свабода)***

# ДЗЯДЫ Ў МЕНСКУ

2 лістапада на заклік Кансэрватыўна-Хрысьцінскай Партыі – БНФ беларускія патрыёты прышлі да Гадзіньнікавага завода, што на праспэкце Ф. Скарыны ў цэнтры сталіцы. Аб 11.00 пачалося мэмарыяльнае шэсьце ў бок Курапатаў. Больш за дзьве тысячы людзей несьлі нацыянальныя Бел-Чырвона-Белыя Сьцягі, выявы Пагоні, кветкі. Маладзейшыя несьлі праз галоўную артэрыю горада крыжы, якія меліся быць усталяваныя ў Курапатах. Людзі несьлі транспаранты „Ушануйма ахвяраў Курапат", „Абаронім Беларусь ад расейскай агрэсіі!" Шэсьце гукала магутным хорам: „Жыве Беларусь! Жыве незалежная Беларусь!". На скрыжаваньні праспэкту Скарыны і вул. Каліноўскага калёна прыпынілася на некалькі хвілінаў. Удзельнікі даўніх падзеяў, што ішлі ў калёне, распавялі моладзі, што з гэтага месца 30 кастрычніка 1988 года пачаўся змагарны выступ на Дзяды. А з таго выступу ўласна пачалася наша народная рэвалюцыя, што прывяла Беларусь да незалежнасьці.

Аб 14.30. калёна дасягнула Курапатаў і распачаўся мэмарыяльны мітынг. Людзі засьпявалі гімн „Магутны Божа". Быў зачытаны зварот сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „Дзяды, Дзяды, будзьце з намі!" Выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў на Беларусі старшыні Фронту і Партыі, сп. Сяргей Папкоў, намесьнік старшыні Фронту і Партыі, а таксама сп. Валеры Буйвал, сакратар Управы Фронту і Партыі. Выступоўцы падзяквалі людзей за ўдзел у шматкілёмэтровым шэсьці. Адзначылілі, што традыцыйныя мерапрыемствы на Дзяды злучаюць і мацуюць наш народ. Сёлета споўнілася 20 год з дня Дзядоў у 1988 годзе. Антыбеларускі рэжым ня здолеў сьцерці з народнай памяці тыя славутыя падзеі Адраджэньня Беларусі. Сьвет зьмяніўся з тае пары. Рассыпаўся наіўны стэрэатып пра „дэмакратычную Расею". Мы назіраем, як расейскі гэбізм пачынае адкрытую брутальную агрэсію на постсавецкай прасторы. Але народы ня згодныя на

вяртаньне расейскай імпэрыі. Змаганьне за незалежнасьць і волю мужнага грузінскага народу павінна быць прыкладам для нас. Калі будзе пагроза нашай Дзяржаве і незалежнасьці з боку расейскага агрэсара, беларусы таксама будуць бараніць ад захопнікаў родную зямлю – паводле нашай Канстытуцыі, нашай гістарычнай традыцыі і прыроднага права. Гэта ёсьць запавет нашых Дзядоў, якія на працягу стагоддзяў змагаліся супраць маскоўскай арды.

Мы з году ў год будзем прыходзіць у Курапаты. Бо нашы Дзяды дораць нам Боскае сьвятло, гавораць аб сьвятым і вечным. Нездарма ненавісьнікі і ворагі Беларусі імкнуцца зьнішчыць нашую сьвятыню. Учора ўвечары нашы актывіты, якія дзяжурылі на тэрыторыі Народнага мэмарыялу ў Курапатах, схапілі двух расейскіх фашыстаў, якія зьнішчылі пяць крыжоў на магілах ахвяраў. Вандалаў здалі ў міліцыю. Але ўжо падчас складаньня пратаколаў беларусы адчулі, што прадстаўнікі ўлады спрабуюць схаваць сапраўдны сэнс падзеі, каб пазбавіць ад крымінальнай адказнасьці злоўленых злачынцаў. Аднак ня ўдасца гэтым зьнішчальнікам і тым, хто накіроўвае іх, пазьбегнуць адказнасьці. Ужо цяпер на іх ляжыць народны праклён і вечная ганьба. Яны будуць пакараны сурова і справядліва ў адпаведнасьці з літарай і зьместам Закона.

На прыканцы выступіў паэт сп. Генадзь Тумаш. Ён гаварыў пра неабходнасьць бараніць родную культуру і мову, пра супраціў русіфікацыі. У паэтычных радках прагучала хваляваньне за будучыню Беларусі.

Усе, хто прышоў у Курапаты, адчулі: прышласьць Беларусі сьветлая і прыўкрасная. Абсалютная большасьць удзельнікаў мерапрыемстваў – маладыя хлапцы і дзяўчаты, новае пакаленьне, якому належыць будучыня. Беларускі дух непераможны. Загіне імпэрыя зла, а наш народ будзе жыць вечна.

Пасьля заканчэньня мітынгу людзі ўсталявалі крыжы, усклалі кветкі, запалілі зьнічкі на магілах пакутнікаў. Над Курапатамі гучаў гімн „Магутны Божа".

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В. Буйвал)***

*2 лістапада 2008 г.*

## ДЗЯДЫ, ДЗЯДЫ, БУДЗЬЦЕ З НАМІ!

***(Выступ на Дзядах ў Курапатах 2 лістапада 2008 г.)***

Дарагія землякі, дарагія фронтаўцы. Сёньня Сьвятыя Дзяды, і мы, як заўсёды, як вось ужо 20 гадоў, зноў тут, у Курапатах, разам з Дзядамі. Мы зноў, як і кожны год, прынесьлі сюды на плячах крыжы на безыменныя, брацкія магілы народа. Гэтак стварыўся і ствараецца далей ***Народны Мэмарыял Курапаты***.

Курапаты абверглі камуністычную хлусьню, быццам бы сталінскі тэрор і рэпрэсіі датычыліся ў асноўным толькі кампартыі і яе кіраўнікоў. Адкрыцьцём Курапатаў засьведчана, што быў плянавы генацыд Беларускага народа. Тут адкрытыя ўлікі масавага забойства – прастрэленыя рэшткі людзей. Нас вынішчалі мэтадычна і па графіку. На Беларусі была створана цэлая сістэма масавых расстрэлаў, якая працавала, як машына. За часы савецкай акупацыі (улічваючы 20-я гады) камуністы забілі ў нас больш двух мільёнаў беларусаў. Прытым за пэрыяд нямецкай акупацыі каля паўмільёна беларусаў забілі так званыя „савецкія партызаны", кіруемыя з Масквы і маскоўскім НКВД.

Толькі ў Курапатах было расстраляна каля чвэрці мільёна людзей. У Беларусі такія вялікія і малыя Курапаты былі вакол кожнага горада. Адбывалася шырокамаштабнае вынішчэньне беларускай нацыі. У першую чаргу татальна забівалі ўсіх нашчадкаў беларускай шляхты і людзей шляхецкага паходжаньня. Потым зьнішчана была беларуская адміністрацыя (у тым ліку і камуністычная), выбівалі людзей творчых і інтэлігентных, масава вынішчалі сялянства. Сяляне працавітыя, гаспадарныя, заможныя былі расстраляныя, рэшта ператворана ў калгасных рабоў.

Дасьледваньне Курапатаў выявіла, што вынішчэньне беларусаў было плянавым. На кожную вобласьць, раён і сельсавет з Масквы спускалася разнарадка на пастаўку ў турмы і на расстрэл пэўнай колькасьці людзей у месяц. (Маскоўцы называлі іх гнюсьненькім тэрмінам – „врагі народа".) Невыкананьне пляну і зрыў разнарадкі пагражала расстрэлам тым, хто быў адказны за выкананьне пляну. Кожны дзень па тэлефоне ў Маскву зь Менскага НКВД перадавалі зьвесткі пра колькасьць асуджаных і расстраляных. А ў Маскве вёўся рэестравы ўлік забітых, асуджаных і вывезеных беларусаў.

Так працавала гэтая маскоўская машына забіваньня людзей. І нават вайна не спыніла расейска-бальшавіцкага генацыду. Вынайшлі новыя формы вынішчэньня вайной.

Расейска-бальшавіцкія злачынствы супраць чалавецтва не былі юрыдычна асуджаныя міжнароднай супольнасьцю. Прычына гэтага ў тым, што не была дабітая і зьнішчаная ў сваім логаве маскоўская імпэрская гідра, якая спарадзіла бальшавіцкі генацыд. Наадварот, Заходняя Эўропа, Тоні Блэр, Жак Шырак, прэзыдэнт Клінтан (пасьля паўраспаду савецкай імпэрыі ў 1991 годзе) зрабілі шмат, каб Маскоўшчына засталася на паверхні, каб яна не патапілася і без варункаў плыла далей. У выніку ў Расеі цяпер пануе гэбізм – абсалютная карпратыўная ўлада КГБ, энкавэдзісцкі рэжым прафашысцкага кшталту, які ўжо агрэсіўна шчэрыцца на вольны сьвет і бразгае зброяй. Нашчадкі тых, што забівалі ў Курапатах, уладараць цяпер у Расеі. З жалем прыходзіцца адзначаць, што палітычны Захад, спарадзіўшы камунізм і фашызм, так нічаму і не навучыўся за ўсю крывавую гісторыю XX-га стагоддзя.

Народ, які падвергся генацыду і вынішчэньню, валодае асаблівым правам ў сьвеце. Гэта ёсьць зборнае права нявіннай крыві. Ніякае пытаньне, якое датычыць існаваньня нацыі і яе жыцьцёвых інтарэсаў, ворагі чалавецтва ня могуць зманіпуляваць без уліку імі забітых мірных людзей з мэтаю вынішчэньня. Гэта павінна быць уведзена ***ў наш будучы вольны беларускі і міжнародны закон***. Гэты закон павінен абмежаваць забойцаў народа ў бясчынствах над трунамі. І калі якія-небудзь варвары пачнуць пытацца, пагражаючы, ці трэба беларусам іхняя культура, свабода ці мова, то трэба найперш спытацца пра гэта ў тых, каго яны забілі толькі за тое, што былі беларусамі. Хай падымуць з магіл і спытаюць..

Два мільёны галасоў гучаць, сьведчаць з таго сьвету за жыцьцё Беларусі, за нашчадкаў, за вечны народ. Гэта галасы расстраляных нашых дзядоў. Гэта нашы саюзьнікі. Мы, і ўсе людзі, павінны іх чуць. Яны маюць права, каб іх пачулі, бо здабылі яго пакутлівай сьмерцю. На гэтым праве будзе вяршыцца і апошні Боскі прысуд. Сьмерць часткі народа праз генацыд – гэта вялікая наша страта. Але гэта ёсьць і вялікая наша сіла. Сіла трагедыі, перамога ідэй, якая павінна стацца законам.

Успомнім жа нашых дарагіх і вялікіх дзядоў, каб ніхто не застаўся забыты. Тут і вялікія нашы пісьменьнікі, і паэты, і вялікія змагары за шчасьце Беларусі. Але я хацеў бы ўспомніць найперш майго сябру, сьціплага найвыдатнейшага чалавека і шчырага беларуса, зь якім мы некалі разам хадзілі па Курапатах, марылі пра справядлівасьць і сьветлы дзень. Гэта імя Яўгена Ігнатавіча Шмыгалёва, падпісанта артыкула „Курапаты – Дарога сьмерці". Гэта быў чалавек рэдкаснай прыстойнасьці і сьветлай веры. Апошні раз я бачыўся зь Яўгенам Ігнатавічам у восень 1995 года. Ён быў, як заўсёды, спакойны, але вельмі сумны.

– Што з табой, Ігнатавіч? Што за бяда?

– Бяда, – паўтарыў Шмыгалёў. Пасьля доўгага маўчаньня ён сказаў мне, што хворы невылечнай хваробай і што яму адмерана яшчэ паўтары-два гады.

Цяжкае гэта было прызнаньне. Яўген Ігнатавіч памёр 1-га верасьня 2000 года. Меў 72 гады. Вечная памяць. Пухам зямля.

Успомнім жа добрымі словамі нашых дзядоў і зразумейма, што ўсе мы разам: і тыя, што там, і тыя, што тут. І метафізіка, і рэчаіснасьць існуе ў адным. І ў гэтым – духоўная вечнасьць чалавецтва і духоўная сіла народа.

Хвала дзядам! Слава Беларусі! Дзяды, дзяды, будзьце з намі!

Дзяды ў Лошыцы

Працягваюцца нашы Дзяды. 9 лістапада акцыя КХП – БНФ адбылася ў Лошыцы на месцы былога яру, дзе некалі, у 1937 годзе, расейскія энкавэдзісты расстрэльвалі людзей.

Так склалася наша цяжкая гісторыя, што мы першым чынам мусім захаваць памяць пра генацыд. Гэта вельмі важна для разьвіцьця і нацыянальнага адраджэньня народу, бо ўзбуджае пачуцьцё неспатолі духа – неажыцьцёўленай справядлівасьці, да якой імкнецца кожны чалавек. Памяць пра генацыд гуртуе тых, што засталіся жыць, вядзе да супольных развяг

і дзеяньняў на лепшую прышласьць. Гэта натуральная духоўная рэакцыя людзей на небясьпеку. Курапаты якраз добра засьведчылі гэты працэс.

Мы бачым, што дзіўным і заканамерным чынам Дзяды ператвараюцца ў галоўнае духоўнае сьвята беларускага народа і нацыянальнага адраджэньня. Гэта вельмі станоўчая зьява. Падтрымлівайма яе. Адзначайма ў скрусе, моцнасьці духа і ў пашане, ведаючы, што кожны з нас, франтаўцаў, аддаў гэтай справе часьцінку сваёй душы, працы і добрых разваг. Байкот рэжымных выбараў нашым насельніцтвам паказаў, што час мяняецца. Наперадзе лепшыя дні. Набліжайма іх зь вераю і спакоем, з моцаю і надзеяй.

Хвала, слава і шанаваньне Дзядам!

***Зянон Пазьняк***

*9 лістапада 2008 г.*

# ВЫРАДЖЭНЬНЕ. ЗЛАВЕСНЫ ЗНАК УНУТРАННАЙ АКУПАЦЫІ

***У беларускай вёсцы у цэнтры Беларусі вяскоўцы-беларусы зьбілі аднавяскоўца-беларуса за размову па-беларуску. Гэты змрочны сымвалічны факт можна прыраўняць да „жмені пустых арэхаў”.***

Цытата з радыё „Свабода”: **„15 лістапада вядомага мастака Алеся Пушкіна ў вёсцы Бобр Крупскага раёну цяжка зьбілі 5 мясцовых хуліганаў, сярод якіх быў навучэнец школы міліцыі Сяргей Шынкевіч. Прычынай агрэсіі стала беларуская мова.”**

**Пакалечаны Пушкін, відаць, адчуў, як сьведамы беларус і як мастак, панурую сымволіку зьявы і пасьля арышту разбойнікаў прапанаваў ім выбар: альбо крымінальная справа і турэмная камэра, альбо пакаяньне ў царкве. Ўсе прыйшлі ў царкву...**

**Мастак за свой кошт даў ім фармальны шанец не памерці вырадкамі. Але гэта толькі яго сымволіка. Подых выраджэньня трывае далей. Людзі, якіх узрушыла і зацікавіла гэтая падзея, абмяркоўваюць выключна толькі разумны ўчынак мастака Пушкіна, але жах праклятага часу нацыянальнага суіцыду, увасабленьнем якога сталі пяць вырадкаў, вымагае задумацца ўсім, як на краі бездані, пра выбар усіх.**

***Мар’ян Ванькевіч***

# ЯК АДБЫВАЕЦЦА ЎНУТРАННАЯ АКУПАЦЫЯ

Інфармацыя за лістапад. Беларускія прадпрымальнікі паспрабавалі па гаспадарчых справах патрапіць на тэрыторыю вялікай часткі Супрацьпаветранай абароны, што на скрыжаваньні вуліцаў Якуба Коласа і Бялінскага ў Менску (пры саветах там быў штаб ПВА Беларускай Ваеннай акругі). Іх спынілі і патлумачылі, што палову тэрыторыі займае цяпер расейская армія, маўляў таксама ПВА. Расейскія афіцэры па-за часткай ходзяць у цывільным. Жывуць таемна са сваімі сем’ямі ў новабудоўлях Уручча.

***Карэспандэнт***

# НЕКАЛЬКІ НЕАБАВЯЗКОВЫХ ЗАЎВАГ

У апошні час на маю э-по прыходзяць лісты ад маладых сяброў Беларускага руху. Пытаюцца пра Васіля Якавенку ў сувязі зь нядаўняй публікацыяй у „Народнай Волі” ліста гэтага аўтара, дзе крытыкуецца мая асоба. („Дазвольце не пагадзіцца...” – *„ Народная Воля”, – 2008, 3 кастрычніка.*) Шчыра кажучы, ня маю ніякай ахвоты пісаць на гэтую тэму, камэнтаваць гэты ўзровень і марнаваць час на пустое. Я не адказваў нават камуністам. Проста рабіў сваю справу далей. Цяпер, праўда, вырасла новае пакаленьне у неспрыяльных умовах і трэба ўсё ж нешта сказаць

Ліст В. Якавенкі вымоўны і па стылю, і па думках, і нават па цытатах. Аўтар пры нагодзе выказваецца ў мой адрас у гэтым стылі ўжо 20 гадоў. Ня бачу ніякай патрэбы ўдакладняць ягоныя крыўдлівыя дакоры. Тым больш, што па сутнасьці падзеі няма прэтэнзіяў. Я сапраўды паставіў пытаньне аб выгнаньні Якавенкі з Аргкамітэту БНФ за антыфронтаўскія дзеяньні, паводзіны і публікацыі. І Аргкамітэт зь ім разьвітаўся.

Праблема, аднак, была шырэйшай, пра якую ў Фронце ведалі далёка ня ўсе. Умоўна яе можна назваць кшталтам „Пазбаўленьне ад агентуры”. Калі б гэтая праграма ня дзейнічала і калі б я ёй не цікавіўся, то Фронт разбавілі б, растварылі б і патапілі б у самым пачатку.

Якавенка прыйшоў не адзін, адразу прывёў з сабой прыгожую маладую сакратарку, якая пісала ўсе пратаколы Аргкамітэту і добра гаварыла па-беларуску. Толькі ніхто яе дагэтуль ня ведаў. А калі даведаліся – аказалася жонкай афіцэра КГБ, якая прысутнічала ў Фронце, як кажуць, „па сумяшчальніцтву”. (Потым яна займалася бізнэсам, а пазьней, ужо за гэтым рэжымам, працавала на радыё „Свабода” журналісткай і фігуравала ў якасьці палітычнага ўцекача, якога быццам бы перасьледуе рэжым Лукашэнкі. Цяпер працуе ў Празе шэф-рэдактарам чэшскай вэрсіі крамлёўскага часопіса „Россия в глобальной политике”, добра гаворыць па-чэшску.)

Наступным пратэжэ Якавенкі быў такі суб’ект па прозьвішчу Жураўлёў. Фронт, паверыўшы рэкамендацыі, ледзь жылы ні парваў, агітуючы і штурхаючы яго ў Вярхоўны Савет СССР. Калі разабраліся, было ўжо па часе. Жураўлёў стаў Народным дэпутатам СССР ад БНФ (і ён там „навыступаў”). Прыводзілі іншых „змагароў” „за свабоду” (з трымя літарамі ў вачах, як у Пуціна), якіх даводзілася адшываць з парога.

Васіль Быкаў у „Доўгай дарозе да дому” апісваў, як у самым пачатку Аргкамітэту БНФ да яго на кватэру прыйшлі Алесь Емельянаў і Васіль Якавенка і пачалі гаварыць пра неабходнасьць лідэрства ў Фронце. Размова скончылася тым, што Быкаў сказаў Якавенку, а чаму б яму самому „не зрабіць тое”? Так Якавенка, з падачы Васіля Ўладзімеравіча, стаўся каардынатарам і пачаў праяўляць актыўнасьць ў змаганьні за „перабудову” зь лепшымі сіламі КПСС, мяркуючы, што „перестройка – наша судьба”. (У мяне ўзьнікла адчуваньне, што ён яшчэ й цяпер так думае.)

Алесь Емельянаў (пазьней сябра Сойму БНФ) напачатку Фронту рабіў шмат карыснай каардынацыйнай працы. Быў адданым беларусам. Летам 1991 года ён ня вытрымаў падвойнага жыцьця, зьявіўся ў рэдакцыю газэты „Свободные новости” і заявіў пра сваё супрацоўніцтва з КГБ. Матэрыял у газэце так і называўся: „Я был сексотом КГБ” („Свободные новости”, – 1991, чэрвень, №10, с. 7). Гэта было палітычнае харакіры, але застацца сумленным чалавекам і беларусам для Емельянава было вышэй. І, трэба сказаць, франтаўцы па-чалавечаму ўспрынялі і зразумелі ягоны ўчынак. Пасьля сьмерці ўспомнілі яго добрым і шчырым словам.

Але, на жаль, такі сумленны рахунак зрабіў толькі адзін Емельянаў. Шэраг іншых „дэмакратаў”, па ўсім відаць, будуць кусаць і пакусваць бясконца, жывучы са сваім цяжкім грузам да сьмерці.

Ужо заўважана, як некаторыя з гэтай публікі („апазыцыянераў” ды „дэмакратаў”) пры ўспамінаньні майго імя трацяць раўнавагу, сьціскаюць зубкі і кулачкі. Але дарэмна непакояцца таварышы. Усё ж такі ім моцна пашанцавала з прэзыдэнтам і вярхоўным начальствам. У адваротным выпадку ўступіў бы ў дзеяньне закон аб люстрацыях, і пасыпаліся б яны, як гарох. Зрэшты, усё яшчэ наперадзе. Усё лепшае – перад намі.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*7 кастрычніка 2008 г.*

# ЛУБЯНСКІЯ ПАГРОМЫ Ў РАСЕІ

5 сьнежня 2008 г. Румынская газэта „Evenimentul Zilei” піша пра паліцэйска-гэбоўскі напад на штаб-кватэру таварыства „Мэмарыял” у Пецярбурзе. У сядзібу ўварвалася група замаскаваных асобаў. Яны правяліператрус і вывезьлі ўсе архівы таварыства, вынік шматгадовай працы па збору матэр’ялаў аб савецкіх палітычных рэпрэсіях.

Наш камэнтар: Лубянка пайшла напралом. Зусім нядаўна гаспадары Крамля „самараспусьцілі" ўсіх нямцовых-хамакадаў („правые сілы") і скляпалі зь іх пракрамлёўскае „Правое дело", надаўшы яму ў якасьці партыйнага сымвала чырвоную зорку (!!!). З праваабаронцамі справа замарудзілася. Яны самаліквідавацца не захацелі. Старшыня Маскоўскай Гэльсінскай групы Л. Аляксеева і яшчэ 50 праваабарончых арганізацыяў Расеі дэманстрацыйна адмовіліся ехаць на арагнізаваны Крамлём-Лубянкай „праваабарончы зьезд", які мае адбыцца ў Пензе. Там, зразумела, мяркуецца стварыць пракрамлёўскае „Праваабарончае дело". Тады гэбэ пачало граміць архівы няўступлівых. І можна было б ім паспачуваць. Калі б мы ня ведалі, колькі разоў гэтыя піцерскія і маскоўскія праваабаронцы тусаваліся ў Менску, падтрымліваючы падстаўных вінцучкоў-мілінкевічаў. Можа яны ня ведалі, што гэта ўсё лубянскі праект? А-я-я-я-яй!

*Юрка Марозаў*

# КНІГІ ПРА БЕЛАРУСКАЕ АДРАДЖЭНЬНЕ*

Навале маскоўскай макулатуры, татальнай русіфікацыі кнігадруку ў нашай краіне супрацьстаяць беларускія аўтары, якія ствараюць беларускія кнігі ў замежжы. У 2007 годзе вышлі ў свет дзьве чарговыя кнігі Зянона Пазьняка, а таксама кніга Галіны Пазьняк.

„Дарога" – новая кніга паэта і фотамастака Зянона. Нізка фотаздымкаў адлюстроўвае краявіды беларускай зямлі, помнікі архітэктуры Вільні. Яны часам камэрныя, часам дыхаюць прасторай і веліччу. Глыбокая філасофія вершаў і фотакарцін Зянона даступная кожнаму чалавеку, у якога жывая душа і шчырае сэрца. Тонкай лірыкай прасякнуты вершы пра каханьне, родны край, чалавечы лёс ("Наша зямля", „Настальгія", цыкл „От добра"). Пафас барацьбы за Айчыну, нацыянальнай гісторыі гучыць у вершах „Белы рыцар", „Прадвызначэньне", „Вечны вобраз". Асобная глава выданьня – гэта вершы і фота, прысьвечаныя Амэрыцы. Аўтар глядзіць на чужыну праз прызму беларускай душы. Кур'ёзныя ўражанбні і яркія перажываньні пераплятаюцца ў радках і фотавобразах небеларускага жыцця. Беларусь для Зянона – „У сьвеце чужым / Толькі адна апора, крыніца цяпла…"

Кніга „Развагі" Зянона Пазьняка мае падтытул „Канцэпцыя новага Беларускага Адраджэньня. Кн. 1, артыкулы і матэр'ялы (1990 – III. 1996)". Сам аўтар вызначае ў прадмове галоўную задачу выданьня: „Адлюстраваць сутнасьць палітычнага становішча і канцэпцыю дзеяньняў Беларускага нацыянальнага Адраджэньня, канцэпцыю, якая прывяла да перамогі – здабыцця незалежнасьці Беларусі". Кніга прадстаўляе артыкулы Зянона Пазьняка і інтэрвію зь ім, надрукаваныя ў беларускім друку на працягу змагарных шасьці гадоў. У гэтых тэкстах адчуваецца жывы пульс падзеяў, сфармуляваны адэкватныя высновы і прагнозы, якія зьдзейсьніліся праз пэўны час. Сабранае разам, гэта больш чым публіцыстыка ў звычайным сэнсе слова. Гэта хутчэй энцыклапэдыя Беларускага Адраджэньня, на старонках якой разгарнуліся драматычныя падзеі нашай эпохі. Удзельнікі тых падзеяў многае ўспомняць, знойдуць сваё месца ў плыні адлюстраваных фактаў. Для маладых гэтая кніга ёсьць сапраўды непаўторны гістарычны матэр'ял дзеля асэнсаваньня часу, у якім яны не жылі. Аўтар зрабіў вялікую працу па збору і сістэматызацыі матэр'ялу. Кніга мае высокае навуковае значэньне.

Выданне ілюстравана выдатным дакумэнтальным і мастацкім фотаматэр'ялам. Некаторыя з фотаздымкаў публікаваліся ў тыя часы. Але многія апублікаваны ўпершыню. Шматтысячныя дэманстрацыі і мужны супраціў самотнага беларуса, партрэты паплечнікаў, плякаты з вельмі вострымі тэкстоўкамі ў руках дэманстрантаў, і самае галоўнае – яркі кантраст паміж светлымі тварамі змагароўадраджэнцаў і дзікімі партрэтамі ненавісьнікаў Беларусі. Гэтае супрацьстаяньне і дагэтуль вызначае сэнс сучаснае беларускае гісторыі.

„Беларусь у сэрцы" – аўтабіяграфічная кніга Галіны Пазьняк. Але па волі лёсу біяграфія аўтаркі сталася часткай біяграфіі нашай краіны. Знаходзячыся ў цэнтры барацьбы за незалежнасць Беларусі, Галіна Пазьняк занатавала і апублікавала цяпер шэраг фактаў і падзеяў, якія без яе памяці і яе пяра забыліся б і яшчэ горш, сталіся б аб'ектам для фальсіфікацыяў і прыдумак (што мы, на жаль, назіраем цяпер у „мемуарах" некаторых дзеячаў, роля якіх у нацыянальным Адраджэньні была мягка кажучы сумніўнай). Мова кнігі жывая і сакавітая, чытаецца на адным дыханні. Аўтарка перадае настрой, фарбы падзеяў, прадстаўляе чытачу праўдзівыя карціны часу. Вось, напрыклад, старонка, прысвечаная 100-тысячнаму мітынгу 26 лютага 1990 г. у Менску, калі фронтаўка прымусіла генсека КПБ здаць ахвяраваньне на БНФ : „Я з сябрамі зьбірала на мітынгу ахвяраваньні. Я нечакана разварочваюся да Я. Сакалова і са сьмехам прапаную: ахвяруйце на Народны Фронт! Сакалоў бездапаможна і разгублена адступіў на крок-другі. Каб адчапіцца, ён кінуў у скрыню пяць рублёў. Сьмяялася ўся плошча…" Главы, прысьвечаныя змагарнай працы ў Менскім гарсавеце, у структурах Народнага Фронту, за межамі радзімы, узбагачаны фотаздымкамі.

Тры кнігі пра нацыянальнае Адраджэньне – надзвычай важны ўнёсак у беларускі кнігадрук на працягу ўсяго аднаго года. Цяпер і праз дзесяцігоддзі яны абавязкава знойдуць свайго чытача.

*Валеры Буйвал*

* Зянон. Дарога. (Вершы і фатаграфіі). Варшава-Вільня, „Беларускія Ведамасьці", Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2007 – 430 ст., іл. Зянон Пазьняк. Развагі. Канцэпцыя новага Беларускага Адраджэньня. Кн. 1, артыкулы і матэр'ялы (1990 – III. 1996). Варшава-Нью Ёрк-Вільня, „Беларускія Ведамасьці", Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2007 – 312 ст., іл. Галіна Пазьняк. Беларусь у сэрцы. Варшава-Нью Ёрк-Вільня, „Беларускія Ведамасьці", Таварыства Беларускай Культуры ў Летуве, 2007 – 240 ст, іл

# ЛІСТАПАД НА СЛУЧЧЫНЕ

Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ правяла мэмарыяльныя мерапрыемствы ў гонар 88-х угодкаў Слуцкага Збройнага Чыну. 30 лістапада аўтобус з менскімі сябрамі Партыі ад'ехаў на Случчыну. Патрыёты наведалі мясьціны, дзе адбываліся галоўныя падзеі Слуцкага Збройнага Чыну: вёскі Грозаў і Семежава, а таксама мястэчка Вызну (цяпер Чырвоная Слабада). Людзі сьпявалі рэлігійныя і ваярскія гімны каля манумэнтальных крыжоў, усталяваных фронтаўцамі ў 1990-я гады, ускладалі кветкі, запальвалі зьнічкі. Над грамадой луналі нацыянальныя Бел-Чырвона-Белыя Сьцягі, харугва з выявай Пагоні. На мэмарыяльных мітынгах выступілі сакратары Управы Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ сп. Валеры Буйвал і сп. Алесь Чахольскі. Яны казалі пра вялікі подзьвіг случакоў, якія ў лістападзе-сьнежні 1920 года засланілі Беларусь ад расейска-бальшавіцкай арды. Сілы былі няроўныя, вораг меў лепшую зброю, чырвоныя камісары гналі ў бой дзесяткі тысячаў паднявольных людзей. Але палкі слуцкіх дабраахвотнікаў грамілі ворага, гналі яго з сваёй зямлі, змагаліся, пакуль ставала сілы.

Гэты подзьвіг меў вялікае гістарычнае значэньне для нашай краіны. Мужны супраціў народу на Случчыне вымусіў бальшавікоў адмовіцца ад поўнага зьнішчэньня Беларускай дзяржаўнасьці і пайсьці на ўтварэньне БССР. Такім чынам, слуцкія героі змагаліся і за нашую будучыню, за Беларускую дзяржаву, адроджаную ў 1991 годзе. Але падзеі тае пары даюць нашым сучасьнікам таксама іншую навуку. У 1917-20 гадах значная частка насельніцтва Беларусі засталася пасіўным назіральнікам нашай нацыянальнай драмы. Многія людзі меркавалі адседзецца, прыстасавацца да „новай улады".

Маскоўскія акупанты, захапіўшы нашую краіну, з першых дзён пачалі зьдзяйсьняць палітыку генацыду беларускага народу, зьнішчэньня нашай культуры і мовы. Гісторыя паўтараецца сёньня на новым вітку. Зноў Масква ашчэрваецца на Беларусь. Зноў пад абяцанкі „зямнога раю" і „славянскага адзінства" Крэмль разьлічвае беспакарана зьнішчаць наш народ і эксплуатаваць нашыя нацыянальныя багацьці. Менавіта дзеля выкананьня гэтага праекту дзейнічаюць на Беларусі прамаскоўскі марыянэткавы рэжым і прышпіленая да яго прамаскоўская псэўдаапазыцыя. Беларусы не павінны даць сябе падмануць. Трэба салідарна абараніць нашую Айчыну ад лютага ворага, які зноў лезе на нашую зямлю з сваімі „іскандэрамі", мафіяй і імпэрскім маразмам.

Выступоўцы нагадалі, што беларусам удалося стварыць 100-тысячную нацыянальную армію ў жніўні-верасьне 1917 года. Але яна была далёка ад Беларусі – на Румынскім фронце. У 1920 годзе было недастаткова сілаў, каб разграміць маскоўскіх захопнікаў. Нацыя павінна мець сваю армію, сапраўды нацыянальнае войска, прасякнутае не „савецкім патрыятызмам", а беларускім змагарным духам. І жыць наша армія павінна на роднай беларускай мове, а не на мове акупантаў. Тады наш народ будзе непераможным. У Вызьне людзі ўсклалі кветкі на месцы, дзе вандалы колькі гадоў таму зламалі манумэнтальны крыж. Камандваў вандаламі мясцовы служка РПЦ ў сутане. Ён крычаў, калі зьнішчалі крыж: „Убрать сей сатанинский крест! Неправильный крест!" Гістарычная форма беларускага Крыжа – Крыжа Еўфрасіньні Полацкай – выклікала нянавісьць у расейца з РПЦ. І гэта таксама навука беларусам. Служэньне Богу і народу на Беларусі можа быць толькі на беларускай мове, з любоўю да нашай традыцыі і духоўнасьці. Усё акупанцкае – ад нячысьціка.



(Фота І. Багдана)

*Асеньні дзень ў Курапатах.*

На прыканцы праграмы менчукі прыехалі ў Слуцк. Праз цэнтар горада прайшло шэсьце пад Бел-Чырвона-Белымі Сьцягамі, да якога далучыліся мясцовыя жыхары і сябры Партыі з Салігорска, Баранавічаў, Капыля. Людзі несьлі транспаранты „Слава змагарам Случчыны!", „Абаронім Беларусь ад расейскай імпэрскай агрэсіі!" Перад гістарычным будынкам, дзе ў лістападзе 1920 г. адбыўся зьезд Случчыны, быў праведзены мэмарыяльны мітынг. Быў заслуханы зварот сп. Зянона Пазьняка, Старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ – „88-я гадавіна Слуцкага змаганьня." Выступіў сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў у Беларусі старшыні Фронту і Партыі. Выступоўца гаварыў пра вялікую маральную сілу народнай памяці. Акупацыйныя ўлады ўвесь час імкнуліся і спрабуюць цяпер зацерці памяць пра подзьвіг случакоў. Яны баяцца народнай памяці, што дае сілу і ўпэўненасьць у барацьбе за волю і незалежнасьць. Але ня ўдасца зьнішчальнікам Беларусі пазбавіць нас нашых духоўных каштоўнасьцяў, славутых імёнаў беларускіх герояў, ня ўдасца навязаць нам антычалавечыя псэўдакаштоўнасьці. Маскоўская імпэрыя, супраць якой змагаліся случакі, выходзіць цяпер на чарговы віток самаразбурэньня.

Сакрушальны эканамічны крызіс выклікае і сацыяльную катастрофу ў Расеі. І што ж робіць у гэтай сытуацыі мясцовы прамаскоўскі рэжым? А рэжым кажа беларусам: „У маскоўскім банку крах. І таму трэба несьці свае грошы ў гэты банк…" Такая вычварная логіка гэтага небеларускага рэжыму, што існуе на нашай зямлі. Яны прывязваюць Беларусь яшчэ больш да хворай, правальнай і няшчаснай Расеі. Наш народ павінен не дапусьціць нацыянальнай катастрофы ў абдымках з Імпэрыяй Зла. Наша выратаваньне – ва ўзаемавыгадных сувязях з цывілізаванымі краінамі сьвету, а не з імпэрскай катастрофай. Беларуская народная салідарнасьць ужо мае сваю перамогу. Зусім нядаўна, на верасьнёўскім выбарчым фарсе беларусы адвярнуліся ад рэжыму і яго псэўдаапазыцыі, не пайшлі на выбарчыя ўчасткі. Народны байкот прадэманстраваў моц нашай Салідарнасьці і пустату антынароднага рэжыму, у якога няма будучыні.

Мэмарыяльныя мерапрыемствы завяршыліся ўскладаньнем кветак каля гістарычнага будынка. Людзі сьпявалі духоўны беларускі Гімн „Магутны Божа".

***Інфармацыйная камісія Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В. Буйвал)***

*30 лістапада 2008 г.*

# ПЕРШЫ ЗАЛП „ПА ВРАГУ"

6 сьнежня 2008 г. Чэшская газэта „Mlada Fronta Dnes" піша пра выставу ў Маскве з нагоды 90-годдзя службы савецкай контрвыведкі. Сярод іншага там выстаўлены й дакумэнты 1941 г. З дакумэнтаў бачна, што саветы ў выпадку захопу немцамі Масквы мелі плян узарваць шэраг аб'ектаў у Маскве, „каб не дасталіся ворагу". Сярод іх, напрыклад, царква Васіля Блажэннага на Чырвонай плошчы і Вялікі тэатр.

Наш камэнтар: Яны не пашкадавалі б нават сваю Маскву (здавалася б, прычым тут царква). Што ўжо казаць пра беларускія гарады і вёскі, дзе маскоўскія акупанты ў гады „міру" і вайны зьнішчылі або выкралі большую частку нашай культурнай спадчыны. Дагэтуль на ўскраіне Воршы стаіць ганебны мэмарыял, прысьвечаны першаму залпу „Кацюшы". Туды нават прывозяць публіку з вясельляў, каб ускладаць кветкі. Трэба нагадаць, што гэты першы залп зброі масавага зьнішчэньня саветы далі па цэнтру нашага беларускага горада, у выніку чаго былі забітыя і параненыя сотні беларускіх людзей („сволочей", як выказвалася нкавэдзісцкая ваеншчына).

***Юрка Марозаў***

# РАСЕЙСКІ ФАШЫЗМ

11 сьнежня 2008 г. Польская газэта „Gazeta Wyborcza" піша пра чарговае злачынства маскоўскіх фашыстаў. Новая групоўка пад назовам „Баявая арганізацыя расейскіх нацыяналістаў" даслала паведамленьне ў маскоўскую мэрыю, што ў бліжэйшы сьметнік яны кінулі галаву забітага імі „ворага". На сьметніку сапраўды была знойдзена чалавечая галава. У прыгарадзе Масквы фашысты накінуліся на двух маладых таджыкаў (яны працавалі на мясцовым прадпрыемстве) і пачалі страляць па іх с пісталетаў. Аднаму таджыку ўдалося ўцячы, а 20-гадовага юнака фашысты забілі і адсеклі яму галаву. Праваабарончыя арганізацыі Масквы паведамляюць пра рост колькасьці такіх нападаў на нярускіх па ўсёй Расеі.

Наш камэнтар: Што ж, як казалі расейскія клясыкі: „обыкновенный фашизм"…

***Юрка Марозаў***

**З Ь М Е С Т**


1. З. Пазьняк. Сьветлая, вольная Беларусь хай стане нашым сьцягам . . . . . 1
2. Кастрычніцкі юбілейны пашыраны Сойм Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ . . . . . 5
3. В. Буйвал. Сьнежаньскі Сойм . . . . . 6
4. В. Буйвал. VIII Зьезд Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і X Зьезд Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" . . . . . 7
5. Аб накірунках партыйнай дзейнасьці . . . . . 7
6. З. Пазьняк. Наперадзе вольная Беларусь . . . . . 8
7. Янка Базыль. „Товарішчі, всё делается для стабільності" . . . . . 10
8. Норавы рэжыму . . . . . 10
9. З. Пазьняк. Патрэбны новы народны Рух . . . . . 10
10. Ю. Рымашэўская. Дом генэрала . . . . . 11
11. Алесь Хадасевіч. Навіны зьнішчэньня культуры . . . . . 12
12. З. Пазьняк: „Гэта стала камэртонам для змаганьня з імпэрыяй КПСС" . . . . . 12
13. В. Буйвал. Дзяды ў Менску . . . . . 12
14. З. Пазьняк. Дзяды, дзяды, будзьце з намі! . . . . . 13
15. Мар'ян Ванькевіч. Выраджэньне. Злавесны знак унутраннай акупацыі . . . . . 14
16. Як адбываецца ўнутранная акупацыя . . . . . 14
17. З. Пазьняк. Некалькі неабавязковых заўваг . . . . . 14
18. Юрка Марозаў. Лубянскія пагромы ў Расеі . . . . . 14
19. В. Буйвал. Кнігі пра Беларускае „Адраджэньне" . . . . . 15
20. В. Буйвал. Лістапад на Случчыне . . . . . 15
21. Юрка Марозаў. Першы залп „па врагу" . . . . . 16
22. Юрка Марозаў. Расейскі фашызм . . . . . 16



*Нумар аддрукаваны пры падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02–017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**